Ідзе падпіска на другую палову 20015 года.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

№ 42 (3987)

2 чэрвеня 2015 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

БЕЗ РУЖОВЫХ АКУЛЯРАЎ



Аляксандр КЛАСКОЎСКІ, спецыяльна для "Народнай Волі"

Нашто нам чорны Ленін у жаночым паліто?

Кожны раз, калі праходжу ў Мінску паўз Дом урада, згадваю, як над ім лунаў бел-чырвона-белы сцяг, а на фасадзе красавалася "Пагоня". Дваццаць гадоў таму пасля сумна вядомага рэферэндуму гэтыя сімвалы прыбралі. А вось вялізны чорны помнік Леніну (у паліто, што зашпільваецца чамусьці на жаночы бок) цяперашні рэжым не крануў. Наадварот, галоўны начальнік не аднойчы публічна абараняў Леніна і Сталіна. Неяк прызнаўся: "Мне тэпаць да іх і тэпаць".

Між тым ягоны ўкраінскі калега Пётр Парашэнка падпісаў у маі пакет законаў аб дэкамунізацыі. У прыватнасці, яны забараняюць прапаганду камуністычнага ды нацысцкага рэжымаў, іх сімволікі. Расійскі міністр замежных спраў Сяргей Лаўроў паводле незразумелай логікі абвясціў гэта *"курсам на гераізацыю нацыстаў".* Абурыліся і беларускія посткамуністы – партыя "Справядлівы свет" пад кіраўніцтвам Сяргея Калякіна.

Украінскія законы аб дэкамунізацыі мо і не ідэальныя, але ж, насуперак спекуляцыям, маюць на мэце не забарону на перакананні, а асуджэнне канкрэтных рэжымаў, што заплямілі сябе сістэмнымі злачынствамі. Звышзадача ж у тым, каб грамадства адраклося нарэшце ад таталітарнай матрыцы, бо яна не дае развівацца, трымае нацыю ў заганным коле.

Рана ці позна гэтае ж пытанне стане рубам і перад беларусамі.

Можна пачуць: а чым вам замінаюць тыя помнікі, шыльдачкі з назвамі вуліц у гонар бальшавіцкіх дзеячаў? Ну, па-першае, гэта відавочная анамалія, калі дзясяткамі ўвекавечаны імёны функцыянераў савецкай імперыі, але ў сталіцы няма, напрыклад, вуліцы Васіля Быкава. Трэба кардынальна пераглядаць гэты пантэон на карысць свайго, беларускага.

Па-другое, і гэта найважней, спадчына камуністычнага ладу не дасць Беларусі па-сапраўднаму рэфармавацца, стаць цывілізаванай еўрапейскай краінай. Без разрыву з бальшавіцкім духам (і ў эканоміцы, і ў культуры, і ў мысленні) мы так і будзем жыць, як жыў народ за Сталіным: адгароджаныя ад свету, безабаронныя перад свавольствам дзяржавы.

У 1930-м, калі ішла гвалтоўная калектывізацыя, мой прадзед Вацлаў быў асуджаны "тройкай" за "бандытызм" ды "антысавецкую агітацыю" толькі праз тое, што на вясковым сходзе сказаў, як думаў: нічога людскага з вашых калгасаў не атрымаецца. За адну фразу трапіў у ГУЛАГ, быў рэабілітаваны толькі ў 1960 годзе.

Між тым знаходзяцца абаронцы сталіншчыны (у тым ліку маладыя, сабраныя пад шыльды нібыта незалежных даследчых суполак), якія закідаюць мне ў фэйсбуку: маўляў, няма чаго "пераносіць асабістую псіхатраўму" (прыдумалі ж фармулёвачку) на ўвесь савецкі лад. Даводзяць, што і лічбы рэпрэсій, калі іх размазаць на ўсе гады сталінізму, не такія ўжо і жахлівыя.

Я хоць і гуманіст, але думаю: што б вы заспявалі, смаркачы, калі б трапілі хоць на суткі ў сутарэнні НКВД, дзе невінаватыя, пахаркаўшы крывёю, падпісвалі прызнанні, што яны ворагі народа. За адну толькі ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года ў мінскай "амерыканцы" былі расстраляны больш за сто беларускіх інтэлектуалаў, у тым ліку 22 пісьменнікі. А колькі тысяч прастрэленых чарапоў у курапацкіх магілах? Нават паводле афіцыйных звестак, у БССР было рэпрэсавана агулам 600 тысяч чалавек. Вам мала?

Гэта псіхатраўма не мая асабістая, а ўсёй нацыі. Праз памяць аб вялікай крыві і сёння народ маўчыць, трывае здзекі – ад дэкрэтаў "пра рабства" ў дрэваапрацоўцы, "пра дармаедаў" да выварочвання кішэняў праз гіперінфляцыю і дэвальвацыі. Таму і хочуць наверсе, каб дух дзяржаўнага гвалту, сталіншчыны не знікаў. Нават цэлую "Лінію Сталіна" збудавалі, куды школьнікаў возяць.

Я ж туды ні нагой, і не таму, што абыякавы да той вайны. Мой дзед Іосіф, кулямётчык-чырвонаармеец, загінуў у 1944-м ва Усходняй Прусіі. Там сталінскія палкаводцы паклалі багата беларускіх сялян, мабілізаваных пасля акупацыі. Кідалі ў самае пекла без належнай падрыхтоўкі, як след не ўзброіўшы: маўляў, хай расплачваюцца за тое, што сядзелі тры гады пад немцам. Нібыта тыя былі вінаватыя, што праз бяздарнасць бальшавіцкіх стратэгаў Гітлер за лічаныя дні захапіў палову Беларусі.

Сёння людзей не расстрэльваюць, але паводле мыслення кіроўная вярхоўка бальшавіцкая: дзяржава – усё, чалавек – вінцік. Дзеля захавання ўлады наверсе робяць стаўку на рэпрэсіі, знішчаюць палітычную альтэрнатыву, абвяшчаюць крытыкаў рэжыму ворагамі народа.

Беларускаму кіраўніцтву савецкі ідэалагічны хлам дапамагае трымаць насельніцтва ў цуглях. Але чаму сярод простага люду нямала прыхільнікаў "светлай мінуўшчыны"? Мяркую, найперш праз патэрналізм, страх перад рынкам і свабодай выбару, праз спадзеў, што строгі справядлівы "бацька" пакарае кепскіх чыноўнікаў ды кожнаму маленькаму чалавеку адрэжа смачную лусту. Але ж разуйце вочы: сацыяльнай дзяржавы фактычна даўно няма – каб атрымаць дыплом, нармальнае лячэнне і г.д., трэба аддаць шалёныя грошы.

Пры гэтым мяне не захапляе, калі на той самай Украіне стыхійна крышаць помнікі камуністычнай эпохі. Гэта не толькі вандалізм, але і тое самае бальшавіцкае мысленне: такім жа чынам камуністы некалі скідвалі званы са званіц. Між тым ёсць цывілізаваны варыянт Літвы, дзе артэфакты камуністычнай эпохі звезлі ў парк-музей Грутас.

Помнікі скалупнуць няцяжка, але прагрэсу не будзе, пакуль людзі не выцiснуць бальшавізм з уласных мазгоў. А калі казаць пра Беларусь, то найперш належыць змяніць уладу, для якой Ленін і Сталін, натхняльнікі тэрору супраць уласнага народа, – узор кіраўнікоў.

СЁННЯ

Пагаворым на хіндзі



Сёння пачынаецца візіт у Беларусь прэзідэнта Індыі Пранаба Букерджы. Аляксандр Лукашэнка сустрэнецца з калегам 3 чэрвеня.

Перамовы прэзідэнтаў пройдуць як у вузкім, так і ў пашыраным колах. Дарэчы, Індыя была адной з першых дзяржаў, якая прызнала незалежную Беларусь і ўсталявала з нашай краінай дыпламатычныя адносіны.

ГРОШЫ

Што зменіць новая валютная палітыка?

З учарашняга дня курсы валют вызначаліся на біржы па-новаму.

Таргі замежнымі валютамі на Беларускай валютна-фондавай біржы з 1 чэрвеня перайшлі ў рэжым бесперапыннага двайнога аўкцыёну.

Раней біржавыя таргі ў Беларусі праводзіліся ў рэжыме фіксінгу, пры якім усе здзелкі па адной замежнай валюце ажыццяўляюцца па адным і тым жа курсе.

У ходзе таргоў у рэжыме бесперапыннага двайнога аўкцыёну курсы заключаных здзелак могуць адрозніваца.

Сфарміраваны паводле вынікаў таргоў сярэдняўзважаны курс па доларах ЗША, еўра і расійскіх рублях будзе выкарыстоўвацца Нацыянальным банкам у якасці афіцыйнага курса беларускага рубля да гэтых валют з дня, наступнага за днём правядзення таргоў.

З улікам працягласці гандлёвай сесіі з 11.00 да 12.25 (з улікам перыяду закрыцця) афіцыйныя курсы на сайце рэгулятара будуць публікавацца каля 13.00.

У сувязі з увядзеннем рэжыму бесперапыннага двайнога аўкцыёну з улікам асаблівасцяў яго функцыянавання з 1 чэрвеня на біржавым валютным рынку будуць здзяйсняцца толькі здзелкі куплі, продажу замежнай валюты банкамі і нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі ад свайго імя і за свой кошт, а таксама ад свайго імя і па даручэнні кліентаў пры абавязковым продажы замежнай валюты.

На думку кіраўніка Нацбанка Беларусі **Паўла Калаура**, новая валютная палітыка будзе больш празрыстай і гуткай.

– У гэтым новаўвядзенні ёсць як плюсы, так і мінусы, – адзначае старшы аналітык кампаніі «Альпары» **Вадзім Іосуб**. – Плюс у тым, што бесперапынны двайны аўкцыён – гэта на самай справе максімальна рыначны і празрысты спосаб курсаўтварэння. Стандартны спосаб біржавога гандлю і валютай, і акцыямі. Адным словам – крок наперад. Але пры гэтым тут маецца і свая лыжка дзёгцю. Справа ў тым, што ўся празрыстасць даступна ўдзельнікам рынку, а ў нашых рэаліях – толькі банкам. Мінус у тым, што адбылася значная сегментацыя рынку.

– Ці паўплывае новая валютная палітыка на курсы валют?

– Непасрэдна на курсы валют ніяк не паўплывае, таму нельга сказаць, што гэта прывядзе да ўмацавання беларускага рубля ці наадварот. Але ў выніку можа адбыцца рост валацільнасці, а таксама для насельніцтва павялічыцца розніца паміж курсамі куплі і продажу валют. Зрэшты, мяркую, што гэта будзе часовая з'ява.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

P.S. *Учора падчас таргоў на біржы беларускі рубель умацаваўся да ўсіх асноўных валют. Курс долара знізіўся на 75 рублёў да 14.815 беларускіх рублёў. Еўра абваліўся на 145 рублёў да 16.154. Курс расійскага рубля знізіўся на 1,75 рубля да 278,75.*

ПАМЯЦЬ

Ёсць незаменныя людзі



Мінуў год з дня смерці паэта, грамадскага, культурнага і дзяржаўнага дзеяча **Генадзя Мікалаевіча Бураўкіна.** І накацілі ўспаміны пра гэтага Чалавека з вялікай літары.

– Я ўсёпаглынальна і назаўжды паверыў Настаўніку, якім лічыў і лічу майго былога кіраўніка, яшчэ ў 1986 годзе, – успамінае журналіст Уладзімір Міхарскі. – Набліжалася 19-я партканферэнцыя. Сярод іншага на ёй чакалася і зварочванне распачатай "перабудовы". Напярэдадні на тагачаснай радыёстанцыі "Беларуская маладзёжная" я зладзіў "круглы стол", у якім упершыню ўзялі ўдзел лідары "Талакі", будучай апазіцыі і нават інструктар Мінскага абкама КПБ. Імёны іх сёння вядомы ўсім – не буду пералічваць. Упершыню ж былі ўзняты пытанні аб скасаванні "кіруючай і накіроўваючай" ролі КПСС, дэмакратызацыі, галоснасці ды дзяржаўнасці (нахабства якое!) беларускай мовы. У эфіры, каб умясціцца ў "фармат", усё мусіла прайсці цягам двух дзён запар. І калі прагучала першая частка, пачаўся вэрхал у вярхах КПБ, дзе праграма-"злачынца" была надрукаваная, казалі, у 100 асобніках. Галоўны рэдактар Жанна Літвіна сядзела збялелая паміж выклікамі "на дыван". Можна ўявіць, што і як казалі тагачаснаму кіраўніку Дзяржтэлерадыё Бураўкіну. Але тады яшчэ не навучыліся проста і нахабна здымаць заяўленыя праграмы з эфіру. І непапулярнае рашэнне ўсклалі на Генадзя Мікалаевіча. Я прарваўся да яго і па-юнацку палка даводзіў мудраму беларусу, што гэта можа быць першай і апошняй спробай публічна выказацца маладзёжнаму нацыянальнаму руху, які толькі нараджаецца. Што праз якія дні можа зноў наступіць сталіншчына і "пытанні" ўжо ніколі не ўздымуцца. Краем вока бачыў, як пашыраюцца зрэнкі суразмоўцы. Праграма выйшла ў эфір...

Усё ж такі ёсць незаменныя людзі!!!

ТЫМ ЧАСАМ

Сёння, 2 чэрвеня, у Мінску ў галерэі "Ў" адбудзецца прэзентацыя аўдыёкнігі "Голас паэта": цягам трох гадзін Генадзь Бураўкін чытае амаль 100 сваіх вершаў. На вечарыне памяці выступяць ягоныя сябры, блізкія і аматары творчасці.

ПОДРОБНОСТИ

В Минске решилась судьба самого дорогого белорусского конфиската

ТД «Восточный» огласил результат торгов, на которых продавался самый дорогой в истории белорусского конфиската автомобиль Rolls-Royce Wraith.

Wraith с двигателем объемом 6,6 л ушел за стартовую цену плюс стоимость одного шага (5%) – 3.471.878.550 рублей, что примерно равно 234 тысячам долларов.

Торги заняли около четырех минут, но как они проходили – тайна. Руководство торгового дома не разрешило журналистам присутствовать и тем более фотографировать процесс. Таким образом, личность покупателя тоже осталась неизвестной.

Есть в этой истории и другие подозрительные моменты. Причиной конфискации стало занижение стоимости автомобиля. Перегонщик указал, что машина стоит 245 тысяч долларов, однако на таможне были уверены, что настоящая стоимость – 470 тысяч. Это, впрочем, не помешало продать машину всего за 234 тысячи.

Не удивительно, что покупатель на авто нашелся так быстро, ведь, к примеру, московский дилер Rolls-Royce предлагает почти такой же автомобиль Rolls-Royce Wraith с пробегом в 35 км примерно за 369 тысяч долларов, а это почти на треть дороже.

НАДВОР'Е

Першы тыдзень лета...

Першы тыдзень чэрвеня будзе па-сапраўднаму летнім. Дажджоў і навальніц чакаецца няшмат.

Як распавёў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя **Дзмітрый Рабаў,** умовы надвор'я будзе вызначаць поле павышанага атмасфернага ціску, на фоне якога будзе праходзіць малаактыўны атмасферны фронт.

У аўторак, 2 чэрвеня, будзе пераважна без ападкаў, толькі раніцай і днём па захадзе краіны кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Тэмпература паветра мінімальная ноччу +9...+15°C, максімальная днём +22...+27°C, па поўдні да +29°C.

У сераду месцамі кароткачасовыя дажджы, навальніцы, днём пры навальніцах узмацненне ветру парывамі да 15–18 м/с. Тэмпература паветра мінімальная ноччу +11...+18°C, максімальная днём +23...+30°C, па паўночным захадзе +20...+22°C.

У другой палове тыдня ўладу над надвор'ем возьме антыцыклон, сфарміраваны ў свежай паветранай масе.

У чацвер 4 чэрвеня ноччу і раніцай у асобных раёнах магчымы невялікія кароткачасовыя дажджы, днём пераважна без ападкаў. У дзённыя гадзіны месцамі па поўначы ўзмацненне ветру парывамі да 15–18 м/с. Тэмпература паветра мінімальная ноччу ад +10°C па паўночным захадзе, да +18°C па паўднёвым усходзе, максімальная днём +16...+23°C.

КОНКУРС

Малайцы!!!



Каця Кавальская і Ваня Гудкоўскі, якія выхоўваюцца ў дзіцячых дамах сямейнага тыпу, паспяхова прадставілі Беларусь на XXIII Міжнародным конкурсе талентаў і прыгажосці Little miss world-2015/Little mister world-2015 у Турцыі.

Конкурс праходзіў у турэцкім горадзе Бодрум. Іван Гудкоўскі атрымаў тытул Little Mister World-2015, а таксама стаў пераможцам у асноўнай намінацыі конкурсу Best of the best. Кацярына Кавальская перамагла ў намінацыі «Фотамадэль свету – 2015» у сваёй узроставай катэгорыі (16–18 гадоў).

SOS!

Беларусь – 157-я ў рэйтынгу свабоды слова са 188 краін

Міжнародная арганізацыя «Рэпарцёры без межаў» склала рэйтынг свабоды слова ў краінах паводле вынікаў 2014 года. У яго ўвайшлі 188 краін. Беларусь у гэтым рэйтынгу апынулася 157-й. На адну пазіцыю вышэй за нашу дзяржаву – Ірак, следам за Беларуссю – Егіпет.


З нашых найбліжэйшых суседзяў Польшча – на 18-м месцы, Латвія – на 28-м, Літва – на 31-м, Украіна – на 129-м, Расія – на 152-м.

Пяцёрку лідараў у галіне свабоды слова займаюць Фінляндыя, Нарвегія, Данія, Нідэрланды і Швецыя.


ВІНШУЕМ!




Антон Рудак.



Людміла Рублеўская.



Альгерд Бахарэвіч.



Вольга Гапеева.

Беларускі ПЭН-цэнтр абвясціў лаўрэатаў прэміі «Кніга года-2015».

Прэмія прысуджалася ў трох катэгорыях. Сярод прозы перамагла кніга Альгерда Бахарэвіча «Дзеці Аліндаркі». Найлепшая кніга паэзіі – «Верхні горад» Антона Рудака. У намінацыі «Дзіцячая літаратура» пераможцамі сталі Вольга Гапеева з кнігай «Сумны суп» і Людміла Рублеўская з «Авантурамі студыёзуса Вырвіча».

Найлепшыя кнігі года абіраюць самі пісьменнікі, творы якіх былі апублікаваны летась. Кніга павінна быць выдадзена ў мінулым годзе ды мусіць быць напісана беларусам ці ў Беларусі на любой мове, якой карыстаюцца беларусы.

Увядзенне гэтай прэміі суправаджалася скандалам, паколькі ў прэс-рэлізе ПЭН-цэнтра вялася гаворка пра «дыскрымінацыю рускамоўных аўтараў» у Беларусі. Пазней старшыня ПЭН-цэнтра папрасіў прабачэння за гэтую спрэчную фармулёўку.

ПРЯМАЯ ЛИНИЯ

Сбросить тяжесть с ног

Медики подсчитали: каждый второй взрослый житель планеты страдает от варикозного расширения вен, а каждый третий – от ощущения тяжести в ногах.

Что делать, если постоянно отекают и гудят ноги?

Почему на ногах появляются синяки?

Как справиться с варикозом?

Можно ли вылечить варикоз без операции?

Что делать, если на ногах появилась сосудистая сеточка?

Как правильно подобрать компрессионное белье?



На эти и другие вопросы на «Прямой линии» ответит хирург первой категории, заведующий операционным отделением медицинского центра «ЛОДЭ» **Владимир Николаевич ПАВЛЕНКО.**

Звоните **9 июня** с **17.30** до **19.00** по телефону **328-68-41.**

Присылайте свои вопросы заранее по электронной почте nvonlineinfo@gmail.com с пометкой «Прямая линия».

ПАДЛІЧЫЛІ...


Больш, чым у калгасах?

Сярэдні заробак у папраўчых калоніях – 800 тысяч рублёў, у папраўчых установах адкрытага тыпу – амаль 3 мільёны 800 тысяч рублёў.

Пра гэта паведаміў журналістам начальнік аддзела па наглядзе за законнасцю выканання крымінальных пакаранняў Генеральнай пракуратуры Беларусі Юрый Гарошка.

– У асоб, якія маюць і абавязаны кампенсаваць расходы на ўтрыманне дзяцей, зарплата вышэй. Мы іх стараемся прыцягнуць да лепш аплачваемай работы, – заўважыў ён.

МУДРЫЯ СЛОВЫ



Леанарда да Вінчы:

– Той, хто хоча разбагацець на працягу аднаго дня, будзе на шыбеніцы на працягу года.

АФІЦЫЙНА

ЖЭС зазірне на ваш балкон

Урад Беларусі ўнёс змяненні і дапаўненні ў Правілы карыстання жылымі памяшканнямі, утрымання жылых і дапаможных памяшканняў, якія робяць больш жорсткімі патрабаванні да ўтрымання балконаў і лоджый.

У адпаведнасці з унесенымі зменамі, грамадзянам і арганізацыям у жылым доме забараняецца захоўванне выбуханебяспечных, атрутных і забруджваючых паветра рэчываў і прадметаў (за выключэннем сродкаў барацьбы з грызунамі і іншымі жывёламі), а таксама лёгкаўзгаральных рэчываў з парушэннем правілаў захоўвання і карыстанне не толькі ў жылых памяшканнях, але і на балконах і лоджыях.

Асобным пунктам у Правілах цяпер прапісаны забарона на загрувашчванне балконаў і лоджый.

У Правілы карыстання жылымі памяшканнямі ўнесены і іншыя змены. Так, пры ажыццяўленні прадпрымальніцкай дзейнасці, звязанай з прадастаўленнем месцаў для кароткатэрміновага пражывання, жылыя памяшканні зараз павінны прадастаўляцца з разліку не менш за 6 квадратных метраў жылой плошчы на аднаго чалавека.

Акрамя таго, устаноўлены абавязак уласнікаў жылых памяшканняў праводзіць за свой кошт, у тым ліку з прыцягненнем спецыялізаваных арганізацый, бягучы рамонт катлоў на цвёрдым паліве.

НАРОДНАЯ ЭКОНОМИКА

Владимир КОВАЛКИН:

«Белорусы платят налогов больше, чем американцы»



Сколько белорусы недоплачивают государству за коммуналку? Как заставить власть отчитываться за казенные деньги? Почему не надо сокращать аппарат чиновников? Гость "Народной Воли" – руководитель проекта «Кошт урада» экономист Владимир Ковалкин – знает ответы на эти и другие вопросы.

«Если это не ложь властей, то это манипуляция»

– Владимир, результаты исследований «Кошту ўрада» почти сенсационные. Вы доказали, что, по сути, «жировки» белорусы оплачивают полностью…

– Что касается оплаты услуг ЖКХ, нам ведь как говорят: незначительную часть коммуналки оплачивает население, все остальное – государство. Но населению недоговаривают, что государственный бюджет формируется за счет налогов, пошлин и прочих сборов, которые исправно платят все. То есть мы из своего кармана кладем деньги в бюджет, а бюджет нашими же деньгами оплачивает наши ЖКУ. Бюджет как посредник. Например, в среднем в 2014 году белорусы платили 300 тысяч по жировке, а еще 300 тысяч через налоги в бюджет и по цепочке – ЖКХ. Такие схемы для руководства страны – возможность манипулировать информацией для того, чтобы объяснять населению, что оно все время государству должно.

Такая же ситуация наблюдается и с транспортным налогом.

В конце 2000-х годов государство упразднило Дорожный фонд и отменило сборы с предприятий, заменив акцизом на бензин. То есть было решено на ремонт дорог собирать средства с владельцев авто через акциз на топливо. Бензин подорожал, но казалось, что механизм выбран справедливый: кто больше проехал, тот больше заплатил. Потом случилась девальвация, бензин даже подешевел, и, скорее всего, в какой-то год решили, что деньги, полученные через акциз, надо отправить на иные, более нужные цели. А для населения ввели транспортный налог.

Или прошлогодняя инициатива властей увеличить подоходный налог на 1%. Президент обещал, что все эти деньги отдадут многодетным детям. Но уже сегодня можно абсолютно точно сказать: деньги в полном объеме до многодетных семей не дойдут. Смотрите: бюджет 2015 года содержит строку «Помощь семьям, воспитывающим детей», и если подсчитать, сколько люди заплатили подоходного налога в 2014 году и какую сумму составил 1%, и сравнить с планами 2015 года, то получится, что многодетным семьям уйдет только 2/3 от положенной суммы: 60–65 процентов. Одна треть просто растворилась в бюджете. Президент не сдержал слово и обманул народ? Или чиновники не выполнили соответствующее поручение?

Нам интересно следить за высказываниями президента, правительства и проверять, как они выполняются. Так вот по ЖКХ, транспортному налогу и увеличению на 1% подоходного налога – если это не ложь властей, то это манипуляция информацией и недоговаривание.

– То есть ваш проект создавался в том числе и для того, чтобы контролировать власть?

– Это скорее мониторинг и попытка объяснять людям, как выполняются обещания.

Нам кажется, что налоги должны платить сами граждане, а не предприятия. Это гораздо сильнее дисциплинирует людей. Если человек знает, сколько он платит налогов и куда конкретно они идут, а не растворяются в бюджете, он охотнее их платит и может требовать более высокого качества услуг от государства. У него появится понимание, что государственный бюджет – это большая касса взаимопомощи, и, если, мы туда больше заплатим, мы оттуда и больше сможем взять.

– Ваша команда – это кто?

– Несколько экономистов. Но то, что в госструктурах называют очень сложной и объемной работой, на которую требуется большой человеческий ресурс и масса времени, мы выполняем достаточно быстро. И затраты на это идут копеечные. А на старте нам помогли коллеги из Словакии: они подарили нам сайт, мы перенастроили его под нашу реальность.

Сегодня любой желающий может зайти на наш сайт и получить информацию о бюджете, может воспользоваться нашим «калькулятором» и высчитать, сколько он лично платит налогов. И, к слову, у большинства белорусов налоговая нагрузка составляет 45–55 процентов от доходов. Если кто-то получает на руки, условно говоря, 500 долларов зарплаты, то реально после оплаты услуг (ЖКХ, транспорт и т.д.) ему остается где-то долларов 350. А весь фонд оплаты его труда – это 700–750 долларов. Ведь есть та часть налогов, которые человек не видит, которые за него уже оплатил работодатель – это отчисления в Фонд социальной защиты, подоходный налог и Пенсионный фонд. И есть налоги, которые «спрятаны» в акцизы, НДС.

– Раньше нам все время говорили, что на Западе население платит просто невероятно большие налоги. Выходит, мы им уже не уступаем?

– Если подсчитать в сумме, то мы платим больше, чем американцы, и не уступаем европейским странам, находимся на уровне таких развитых стран, как Франция, Норвегия, Швеция…

Есть хороший показатель под названием «Уровень налоговой нагрузки». Например, в Швеции этот показатель составляет 46,7%, в Италии – 43,4%, в Финляндии – 42,6%, в среднем по Европе – 38%. Если посмотреть на наш консолидированный бюджет, то его соотношение к ВВП будет около 30%, но если прибавить Фонд социальной защиты, куда каждый белорус платит 34% от Фонда заработной платы, то соотношение станет уже 40%, что соответствует среднеевропейскому уровню. Вот такие интересные трюки в государственных финансах.

«В кризисе есть определенный позитив»

– Как экономист, можете сделать прогноз: долго еще белорусы будут жить «так себе»?

– Мне кажется, это зависит от того, как белорусы сами к себе относятся.

Беларусь – государство патерналистское. Государство относится к нам, как к детям, считает, что может нас учить, указывать, что и как нам делать. Мы, как дети, ждем от государства-родителя заботы.

На мой взгляд, эти взаимоотношения в корне неверны. Мы должны исходить из того, что находимся на одном уровне с государством, чиновниками и президентом. Мы должны понимать, что государство – это не трон, скипетр и держава. Государство – это большая корпорация, которая оказывает нам услуги, и мы вправе за свои деньги требовать от него эффективности.

– Можете объяснить, почему в нашей стране все не как у людей? Например, газ стали покупать по цене ниже, чем в прошлом году, а для населения газ подорожал. Доллар упал, а цены на товары как росли, так и растут, импортные лекарства скоро будем покупать, как говорится, только от смерти. Почему мы никогда не чувствуем на себе никаких положительных изменений в экономике?

– Девальвация и инфляция – разные вещи. Инфляция – это рост цен, девальвация – изменение курса доллара. Если девальвация происходит быстро, инфляция за ней не поспевает, растягивается на какой-то период. Инфляция как бы доигрывает девальвацию, и цены все время растут.

На цены также очень сильно влияет государственная монополия. Если есть монополия – нет конкуренции. В Беларуси экономика государственная, 80 процентов предприятий так или иначе принадлежат государству. Им нет смысла бороться за потребителя, снижать цены.

– Слышала мнение, что кризис, который мы сейчас переживаем, – это очень хорошо. Потому что он учит белорусов работать: зарплаты сдуваются до реальных, заработанных, рабочие места сокращаются и скоро за право занимать должность придется бороться. Одним словом, хорошо, что кризис наступил. А вы как считаете?

– Действительно, кто-то говорит, что кризис – это хорошо, потому что происходит обновление. Другие утверждают, что плохо, потому что все беднеют. На мой взгляд, это не плохо и не хорошо, это закономерный этап развития ситуации.

Любая рыночная экономика имеет подъемы и спады. В кризисе важно не то, что падает зарплата, банкротятся неконкурентоспособные предприятия, многие люди беднеют. Кризис – это хороший повод сделать выводы и переоценить то, что ты делал. Можно изменить организацию производства, можно сменить работу, выбрать другое направление деятельности. И в этом есть определенный позитив кризиса.

– Упадет ли в стране уровень жизни после президентских выборов?

– Ближе к выборам зарплаты несколько поднимутся, у бюджетников процентов на 15. И потом мы вернемся к тому, что недавно было: придется опускать курс белорусского рубля.

Нынешняя ситуация в Беларуси во многом мне напоминает конец 1970-х – начало 1980-х годов. С точки зрения общественного уклада у нас происходит то же самое. Например, тогда тоже шла активная борьба с тунеядством. Но по сути и тогда, и сейчас наше правительство расписывается в собственной беспомощности. Кроме того, Беларусь очень сильно зависит от России, и мы будем чувствовать все, что чувствует Россия. А там что происходит? Крым, восток Украины сегодня для России, как Афганистан для СССР. Через лет пять-семь Россия поймет, что ресурсы, выброшенные на войну в Украине, выброшены на ветер, всем станет жить еще хуже. Резервы будут таять, кризис будет усиливаться.

– Как лично вы справляетесь с кризисом?

– В кризис есть спрос на аналитику. В этом плане мне в кризис работается хорошо.

– То есть без работы еще долго не останетесь?

– Планов много, в ближайшем будущем – мониторинг госзакупок. Мы считаем, что сфера госзакупок – одна из самых коррумпированных в нашей стране. И создание такого сайта, который будет собирать информацию из различных источников, анализировать ее и давать журналистам в более понятной форме, будет способствовать тому, что коррупция на тендерах будет снижаться.

Первый такой опыт уже есть. Мы исследовали информацию, размещенную в открытом доступе, о закупке валидаторов для общественного транспорта Минска и пришли к выводу, что закупка проводилась по невероятно высоким ценам. Только 1730 электронных компостеров обошлись бюджету города почти в 12,5 млрд рублей. За каждый компостер было уплачено 7,2 млн рублей, или порядка 730 долларов. После того как наша информация попала в прессу, меня дважды приглашали в Департамент финансовых расследований. Там начата проверка, расследование продолжается.

Второй недавний случай – мы проанализировали закупку сайта для Следственного комитета. Сайт стоил порядка 80 тысяч долларов по тогдашнему курсу, а на рынке такой сайт можно было купить в пределах 1–5 тысяч долларов. Цена была неоправданно высокая.

Безусловно, мы не должны подменять собой ДФР, Генпрокуратуру, но мы те самые граждане, общественность, которые должны привлечь внимание контролирующих органов, потому что у них, возможно, недостаточно времени, чтобы все это изучать. Можно взаимодействовать вместе. И мы этим планируем заняться.

Мария ЭЙСМОНТ.

РЭЙТЫНГ

Багатыя і бедныя

Міністэрства фінансаў Беларусі апублікавала фінансавыя справаздачы адкрытых акцыянерных таварыстваў краіны за 2014 год.

"Беларуськалій" зноў стаў самай прыбытковай кампаніяй краіны. У 2013 годзе праз скандал на калійным рынку салігорская кампанія адкацілася на трэцяе месца, аднак цяпер прыбытак вырас у 4,5 раза.

Гэта дазволіла абысці нафтаперапрацоўчыя заводы ў Мазыры і Наваполацку. Дарэчы, вынік іх працы таксама істотна палепшыўся за год.

Банк развіцця Беларусі на чале з Сяргеем Румасам – установа, праз якую перапампоўваюцца бюджэтныя грошы на дзяржаўныя праграмы. Фінансісту ўдаецца дэманстраваць добрыя лічбы год за годам.

Услед ідуць адзін за адным адразу некалькі банкаў. Наперадзе два дзяржаўныя, аднак і прыватнікі не адстаюць. Фактычна «Прыорбанк» можна лічыць самай прыбытковай кампаніяй з адкрытай справаздачнасцю.

Гэтае званне мусіў мець «Еўрагандаль» (гандлёвая сетка «Еўраопт»). За першыя тры кварталы прыбытак сеткі крам перавышаў 125 мільёнаў долараў, прычым лічбы дэманстравалі пазітыўную тэндэнцыю. Аднак у чацвёртым квартале кампанія не была эмітэнтам аблігацый, таму і не прадастаўляла справаздачнасць. Значыцца, у спісе яе зусім няма.

Сярод прыватных кампаній, якія прынеслі вялікі даход сваім уласнікам, разгалінаваная бізнес-імперыя Юрыя Чыжа і малочная вытворчасць Аляксандра Машэнскага. Іхнія «Трайпл» і «Савушкаў прадукт» на дваіх зарабілі больш за 100 мільёнаў долараў.

№	Кампанія	Прыбытак
1	"Беларуськалій"	696,8
2	Мазырскі НПЗ	317,9
3	"Нафтан"	193,2
4	Банк развіцця Беларусі	163,2
5	"Беларусбанк"	162,9
6	"Белаграпрамбанк"	114,4
7	"Прыорбанк"	92,8
8	"БПС-Сбербанк"	88,7
9	"Белгазпрамбанк"	75,1
10	"Трайпл"	64,5
11	Мінскэнерга	58,2
12	Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман»	57,9
13	"Гомельтранснафта Дружба"	55,8
14	Банк БелВЭБ	49,5
15	"Савушкаў прадукт"	40,8
16	Віцебскэнерга	37,7
17	"Белінвестбанк"	36,3
18	МАПІД	35
19	Брэстэнерга	33,2
20	Гомельэнерга	31,9

Лічбы ўказаны ў мільёнах долараў.

На адваротным баку рэйтынгу прамысловыя гіганты. МАЗ, МТЗ і «Атлант» разам прынеслі катастрафічныя 324 мільёны долараў чыстых страт. Для вядомага бізнесмена Аляксандра Шакуціна год таксама склаўся няўдала. Ягоная кіраўнічая кампанія холдынга «Амкадор» прынесла 9,3 мільёна долараў чыстых страт.

Сярод прыватнікаў горшая сітуацыя толькі ў замежнай «Маскоўскай інвестыцыйнай будаўнічай кампаніі» (-10,6 мільёна).

№	Кампанія	Страты
1	МАЗ	-153
2	МТЗ	-90,4
3	"Атлант"	-80,6
4	БМЗ	-63,5
5	"Гомсельмаш"	-45,7
6	"Гомельшкло"	-25,6
7	БелВітуніфарм	-23,8
8	Светлагорскі ЦКК	-22
9	Барысаўскі мясакамбінат	-20,8
10	Слуцкі сыраробны камбінат	-18,8

Лічбы ўказаны ў мільёнах долараў.

Ягор МАРЦІНОВІЧ, nn.by

СУД

У закрытым рэжыме

Учора ў Віцебску пачаўся суд над заснавальнікам арганізацыі «Платформа інавэйшн», якая займалася абаронай правоў зняволеных, Міхаілам Жамчужным. Працэс праходзіць у Віцебскім абласным судзе ў закрытым рэжыме.

Паводле папярэдніх звестак, Міхаіла Жамчужнага абвінавачваюць па трох артыкулах Крымінальнага кодэкса – 376 (часткі 1, 2), 375 (частка 1) і 431 (часткі 1, 2): у наўмысным раскрыцці звестак, якія ўтрымліваюць службовую таямніцу, незаконным набыцці (вырабе) сродкаў для непублічнага атрымання інфармацыі, якая ўяўляе сабой службовую таямніцу, і ў даванні хабару.

Віцебскі праваабаронца Павел Левінаў, які ўчора прыйшоў у суд, паведаміў:

– Паводле заканадаўчых нормаў, кожны працэс пачынаецца аднолькава: усіх жадаючых запрашаюць у залу, суддзя распачынае работу, прадстаўляецца, называе імёны і прозвішчы ўдзельнікаў працэсу і толькі потым абвяшчае сваё рашэнне – маўляў, працэс будзе закрыты. Я прыйшоў, каб даведацца, хто сакратар на працэсе, хто дзяржаўны абвінаваўца, хто адвакат падсуднага. І, урэшце, як выглядае сам Міхаіл Жамчужны... Аднак я прастаяў пэўны час у фае суда, а ў залу нікто нікога так і не запрасіў!

Убачыць падсуднага спадару Левінаву не ўдалося: машына з СІЗА, дзе ўтрымліваюць Міхаіла Жамчужнага, адразу заехала ва ўнутраны двор. Справу Міхаіла Жамчужнага разглядае суддзя абласнога суда Валянціна Буева.

Паводле звестак з лістоў, якія Міхаіл Жамчужны адсылаў на волю, пачуваецца ён добра, нягледзячы на складаныя ўмовы жыцця ў СІЗА і досыць паважны ўзрост – 60 гадоў. Настроены Жамчужны рашуча. У лісце да грамадскай актывісткі Ганны Шапуцька ён пісаў: «Матэрыялы справы – спрэс фальсіфікацыя і супярэчнасці. Паспрабую падчас суда гэтым скарыстацца».

З прыватнай перапіскі таксама вядома, што ён адмовіўся супрацоўнічаць са следствам, спаслаўшыся на артыкул 27 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, які дазваляе грамадзяніну адмовіцца ад любых сведчанняў, якія могуць быць выкарыстаны супраць яго самога.

Арганізацыю «Платформа інавэйшн» Міхаіл Жамчужны заснаваў разам з Андрэем Бандарэнкам, і затрымалі спадара Жамчужнага неўзабаве пасля арышту Бандарэнкі, у жніўні 2014 года. Паколькі ў Віцебску ён не меў блізкіх сваякоў, пра ягонае затрыманне і арышт стала вядома не адразу.

Жаданне займацца праваабарончай дзейнасцю былы дацэнт Віцебскага тэхналагічнага ўніверсітэта, кандыдат тэхнічных навук, вядомы ў акадэмічным асяроддзі даследчык і вынаходнік Міхаіл Жамчужны тлумачыў наступным чынам. Ён заўжды займаўся чыстай навукай, выкладаў ва ўніверсітэце, кіраваў даследчай лабараторыяй, якая працавала над атрыманнем вадароду дзеля выкарыстання ў прамысловасці. Аднак у 2008 годзе на Жамчужнага завялі крымінальную справу за эканамічныя злоўжыванні. Скончылася прысудам. Пасля вызвалення ў 2012 годзе Жамчужны заявіў, што справа супраць яго была сфабрыкавана. Міхаіл спрабаваў абскардзіць свой прысуд, аднак справа аказалася задужа складанай: яна тычылася навуковых распрацовак і вымагала вялікіх грошай на адвакатаў. Сам сутыкнуўшыся з несправядлівасцю, Міхаіл Жамчужны заняўся праваабарончай дзейнасцю.

Іван ВАСІЛЕВІЧ.

РАЗОБЛАЧЕНИЕ

Был ли в Беларуси сепаратизм?

Воспоминания «кандидата» на должность премьер-министра несуществующей Полесской республики

Бывший премьер-министр Беларуси Вячеслав Кебич в своем интервью телеканалу БТ рассказал, что БНФ в начале 1990-х поднимал вопрос об отделении Полесья. Потом последовали опровержения от некоторых представителей БНФ, потом – уточнения, потом – вопросы... Так были ли в Беларуси сепаратистские настроения?

«Национализм у нас тоже поднял голову. Давайте вспомним, как Белорусский Народный Фронт в лице некоторых руководителей ставил вопрос об отделении Полесья. Я разговаривал со многими полешуками, которые говорили, что к ним приезжали эмиссары. Столько разговоров об этом вели, чтобы сделать Полесскую республику», – утверждает Вячеслав Кебич.

Предложение стать премьер-министром Полесской республики поступило экс-депутату Пинского городского Совета депутатов Виктору Ярошуку. Он рассказал, как все происходило.

– В 1990-е годы активными были такие организации, как «Етвязь» и «Полессе», которые обратили внимание на западных полешуков, развитие их языка, традиций, экономического развития. Руководил ими Николай Шелягович.

В БНФ я никогда не входил, но был руководителем демократической фракции в Пинском горсовете депутатов. Обратился ко мне этот Шелягович. Прозвучало предложение объявить Полесскую республику, а мне занять пост премьер-министра в ней. Зарплату Шелягович обещал в десятки раз больше моей, учительской (*тогда она составляла около 20 долларов*. – **Авт.**). Я отмахнулся от идеи, лишенной здравого смысла, так как считал, что региональный сепаратизм может привести к большим проблемам, тем более в то время в горячей фазе был конфликт между Азербайджаном и Арменией по вопросу Нагорного Карабаха. Я точно знаю, что к представителям БНФ в Пинске Шелягович не обращался. Тем более эта партия всегда выступала за территориальную целостность Беларуси.

– Может, известна история происхождения этой идеи? И при чем тут БНФ?

– Мое мнение, что спецслужбы большого соседствующего с Беларусью государства пытаются создавать такие точки нестабильности в странах, попадающих в сферу их интересов, чтобы влиять на их политику. Нагорный Карабах, Приднестровье, Абхазия, Северная Осетия, теперь ЛНР и ДНР – это звенья одной цепи. В начале 1990-х БНФ была влиятельной политической силой, вскоре в Беларуси должны были состояться первые президентские выборы, на которых мог победить прозападный политик. Поэтому и была попытка разыграть этническую карту. Но белорусы выбрали Александра Лукашенко, поэтому полесский проект свернули.

– А почему для попытки реализации этого проекта выбрали Пинск?

– Пинск уже был столицей Полесской области в СССР. А в горсовете в 1990-е годы была многочисленная фракция оппозиции, с которой считались власти. Если бы Николаю Шеляговичу удалось нас склонить на свою сторону, сценарий мог быть таким: легитимные депутаты объявляют о создании Полесской республики, а далее все происходит, как год назад на востоке Украины.

Кстати, тогда были постоянные попытки вынести вопрос о «Етвязи» на сессию горсовета, но благодаря принципиальной позиции демократической фракции он не проходил. Из-за этого даже поменяли руководителя «Полісся» в Пинском регионе. Членами этой организации были бывшие инструкторы горкома КПСС и даже работники горисполкома. Несколько лет подряд в Пинске проводился музыкальный фестиваль «Етвязь», на который приезжали звезды белорусской эстрады. Издавалась газета «Збудзіннe». На это шли огромные средства, мы себе подобного позволить не могли.

– Почему Кебич вспомнил о так называемой Полесской республике?

– Полагаю, версий несколько. Первая: Вячеслав Кебич – уже пожилой человек и, возможно, не все хорошо помнит. Вторая: президентские выборы (поступил информационный вброс, чтобы власть не расслаблялась и не флиртовала с Западом).

В середине 1990-х тема Западного Полесья затихла, Николай Шелягович перебрался в российский Калининград, возобновил там деятельность организации «Етвязь» и доказывает, что русские и немцы – братья. Причем утверждает, что восточные регионы Германии больше принадлежат к русской цивилизации. Так что, по его версии, полешуки могут претендовать и на часть немецких земель.

О явлении полесского сепаратизма, когда возникла идея создания Полесской республики, рассказал Александр Лукашенко в октябре 2012 года в одном из интервью. По мнению президента, образование этой республики привело бы к потере южной части страны.

Выдержки из трудов Николая Шеляговича:

«Балтское племя ятвягов (которое проживало на территории современного белорусского Полесья) стало важнейшим составляющим в формировании и Русского мира, и Русского народа.

Северная Етвязь, известная истории и под именем По-Руссия, Пруссия, начиная с XIII века, приняла активное участие в формировании и Германского мира, и Германского народа.

Ятвяжская (прусская) составляющая – это то, что делает русских и немцев братьями.

Нынешняя Калининградская область не должна быть элементом перетягивания исторического каната, раздражителем и разъединителем. Общий и для русских, и для немцев ятвяжский/прусский дед своей седой мудростью и мистичностью, своей легендарной организованностью и системностью должен только содействовать Российско-Германской интеграции.

Мое видение, чувствование истории наверняка сначала удивит. Но надеюсь, что в моем взгляде на грани нашей совместной позитивной истории вдумчивый читатель усмотрит прекрасные шансы для сближения/сродненія Русского и Германского миров и народов, без чего немыслим прогресс мирового развития, без чего немыслимо благополучие народов России и Германии! Да, Германия – это стыковая страна между Русской и Западноевропейской цивилизациями. Католические регионы Германии больше являются частью Западноевропейской цивилизации, а восточные регионы и лютеранские анклавы – больше принадлежат к Русской цивилизации».

Василий МАЦКЕВИЧ, («Медиа-Полесье).

ОТ РЕДАКЦИИ

Уважаемые читатели!

Вы чувствуете, как перед важной политической кампанией – президентскими выборами – всплывает всякая пена? Лишь бы отвлечь людей от главного, того, что по-настоящему волнует общество.

Нет, не случайно молчаливый пенсионер Кебич вспомнил какого-то Шеляговича. Да, был такой, более того, даже втерся в доверие к знаменитому на то время писателю Ивану Петровичу Шамякину, который, помнится, поставил свою подпись в поддержку его движения. Но речь шла не о создании какой-то Полесской республики, а о сохранении полесского этноса, его истории, языка, культуры, традиций. И непонятно, зачем В.Кебичу спустя более 20 лет наводить тень на плетень, утверждая, что Белорусский Народный Фронт в лице некоторых его руководителей ставил вопрос об отделении Полесья. Такого и в помине не было. Как не было и разговора о формировании какого-то правительства Полесской республики. Возможно, Шелягович в шутку ляпнул что-то тому же Виктору Ярошуку, но стоит ли это выдавать за серьезность?

Во всей этой истории правдоподобным выглядит одно: и в соседствующей с Беларусью стране, и у нас есть силы, которые, преследуя свои интересы, пытаются отвлечь общественное мнение от главных проблем дня. А такие, как 79-летний Вячеслав Кебич, стараются только подыграть им.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

Не для ўсіх

Як мы паведамлялі раней, Аляксандр Лукашэнка падпісаў закон "Аб амністыі ў сувязі з 70-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне". Пад амністыю маюць трапіць больш як 8,5 тысяч асуджаных. Аднак ці будуць сярод іх палітвязні?

Паводле прагнозу праваабаронцы Валянціна Стэфановіча, амністыя не распаўсюдзіцца ні на кога з палітычных вязняў.

– Альбо артыкулы, паводле якіх яны асуджаны, не падпадаюць пад амністыю, альбо ў адносінах да палітзняволеных адміністрацыя ўстаноў выставіла статус злоснага парушальніка рэжыму – і на такіх асоб амністыя не распаўсюджваецца, – патлумачыў Валянцін Стэфановіч.

– Адносна Юрыя Рубцова, які [illegible], там больш не будзе распаўсюджвацца амністыя.

АФІЦЫЙНА

Выйсці з ценю

Доля ценявой эканомікі ў Беларусі вельмі вялікая. Пра гэта заявіла намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення развіцця лічбавых банкаўскіх тэхналогій Нацбанка, доктар эканамічных навук Людміла Стэфановіч, выступаючы на міжнароднай практычнай канферэнцыі ў Мінску.

"Паводле навуковых даследаванняў, гэтая доля складае каля 35% ад унутранага прадукту", – адзначыла прадстаўнік Нацбанка. Каб вярнуць частку грашовага абароту ў безнаяўны абарот, прымаюцца меры, якія стымулююць працу установ плацежных тэрміналаў, падкрэсліла Стэфановіч. Паводле яе слоў, да 1 ліпеня 2017 года разам з касавым апаратам павінен стаяць плацежны тэрмінал. У краіне ўстаноўлена 92 тыс. плацежных тэрміналаў і 245 тыс. касавых апаратаў. Такім чынам, за два гады неабходна будзе ўстанавіць каля 150 тыс. плацежных тэрміналаў, адзначыла Стэфановіч.

ДАСЛОЎНА

Павел ДАНЕЙКА, адміністрацыйны дырэктар Беларускага эканамічнага даследча-адукацыйнага цэнтра:



– Значную частку беларускіх прадпрымальнікаў ужо нельга прадаць – няма ні знешняга, ні ўнутранага пакупніка. Бо для асобных чыноўнікаў вялікі сакрэт, што прадаецца не станок і сцены, а прадаецца бізнес, прыбыткі заўтрашняга перыяду. Калі прыбыткі не зарабляюцца, то гэта нічога не каштуе. А тое, што можна прадаць, – прадаць немагчыма. Бо ў гэтай краіне няма кваліфікацый у апаратах, які адказвае за гэты працэс, каб правесці гэты працэс. Інвестбанкір – гэта складаная і вельмі дарагая прафесія, і ў сённяшніх умовах наняць такіх людзей і правесці ў сістэму практычна немагчыма. І мы бачым, як пры жаданні правесці прыватызацыйны працэс ён заканчваецца нічым.

СТАЛО ИЗВЕСТНО...

Вакульчик издал жесткий приказ

Глава Белорусской федерации биатлона **Валерий Вакульчик** подписал Приказ №1 об усилении персональной ответственности за факты применения или попытки применения допинга.

Как сообщили в пресс-службе БФБ, в приказе отмечено, что в течение сезона 2014/2015 гг. было выявлено три факта применения допинга зарубежными спортсменами.

В этой связи в случае выявления факта применения или попытки применения допинга белорусскими стреляющими лыжниками исполкому БФБ предписано «*незамедлительно рассматривать вопрос об увольнении соответствующего сотрудника с самостоятельным направлением материалов в органы прокуратуры и Следственный комитет для дачи правовой оценки содеянного и принятия мер*».

В отношении лиц, нарушивших антидопинговые правила, предусмотрены санкции, предусматривающие «*исключение из [illegible] спортивных результатов, включая [illegible], отстранение от соревнований, дисквалификация и увольнение с места работы*».

Кроме того, в соответствии с национальным законодательством в трудовой договор со спортсменами, тренерами и специалистами, работающими в федерации, будут внесены условия о «*недопущении применения допинга и ответственности за нарушения*».

ТРЫВОЖНА!

"Рускі мір" у галаве

Кіраўнік Беларускай асацыяцыі журналістаў Андрэй Бастунец агучыў дадзеныя апытання сацыялагічнага даследавання групы кампаній SATIO. Лічбы трывожныя, заначыў Бастунец.

– Абсалютная большасць гледачоў у Беларусі аддае перавагу рускай мове ў вяшчанні. 65% тэлегледачоў выказаліся за 100%-нае вяшчанне на рускай мове. 32% – за пераважнае вяшчанне на рускай мове. За 100%-нае вяшчанне на беларускай мове выказаліся толькі 1,7% апытаных.

Як зазначыў Андрэй Бастунец, такія вынікі апытання – прамое наступства моўнай палітыкі ў Беларускай дзяржаве ў апошнія два дзесяцігоддзі.

ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ, ШТО...

Беларуская мова блізкая да... кітайскай

Магчымасць стварэння кітайска-беларускага размоўніка разглядае ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны".

Старшыня ТБМ Алег Трусаў заявіў:

– Так сталася, што беларуская мова самая блізкая да кітайскай з усіх славянскіх. У беларускай мове ёсць «дж» «дз», і ў кітайскай мове ёсць. Кітайцу загаварыць па-беларуску вельмі лёгка. Я перакананы ў гэтым, калі ўключу тэлевізар і ўбачу, што кітаец размаўляе па-беларуску, я не здзіўлюся. Я радуюся: нешта здарылася. [illegible] кітайскія журналісты, інтэрв'ю бяруць, [illegible] па-беларуску.

НАЦИОНАЛЬНАЯ ПРОБЛЕМА



Михаил КАДЫРОВ,
доктор сельскохозяйственных наук, профессор, лауреат Государственной премии Беларуси

На земле должен быть хозяин.

А задача государства – создать для его работы хорошие условия

Лет десять назад мне довелось прочитать статью академика [illegible] Дитера Штопца. В ней обосновывалось, [illegible] в Республике Беларусь сначала на площади 10 тысяч гектаров, а затем и на значительно большей можно очень быстро увеличить урожайность зерновых с 19 до 60 центнеров с гектара.

Казалось бы, сугубо земледельческий вопрос. Но в качестве эпиграфа к его публикации были приведены слова знаменитого французского писателя и путешественника Антуана де Сент-Экзюпери: «*Если ты соберешь мужчин, чтобы построить лодку, не проси их заготовить древесину и подготовить инструмент, а научи их тосковать о далеком, бескрайнем море*».

О чем мысль? О том, что реальные успехи в сельском хозяйстве невозможны без искренне заинтересованного, культурного и прагматичного хозяина на земле, но в то же время где-то «идеалиста», видящего вперед достойную жизненную цель.

Вопрос о необходимости реформирования аграрного сектора звучит в последнее время все более настойчиво. А.Лукашенко сказал, что в ближайшее время состоится совещание по стратегическим вопросам дальнейшего развития белорусского АПК. Подготовка данного материала и продиктована этим важнейшим ожидаемым событием.

Предлагаемые или директивно доводимые сверху рекомендации или распоряжения, как показывает история АПК Беларуси, весьма сложно, часто безрезультатно реализуются «в низах» при преобладании там инертности, безразличия, безынициативности, иждивенчества. И люди – носители таких качеств стали таковыми вовсе не по своей воле. [illegible]

Взгляд в аграрную историю

Мне представляется очень важным кратко вспомнить историю реформирования в сельском хозяйстве, чтобы извлечь необходимые уроки. [illegible]

[illegible] опасность сплотила людей. После победы в Великой Отечественной войне все ожидали перемен. В деревню вернулись демобилизованные солдаты, освободившие от фашизма Европу, много пережившие и повидавшие, в том числе традиции, культуру и уровень жизни европейской деревни и принявшие «колхозные», но приводящие к достатку и процветанию формы хозяйствования на земле. После войны советская деревня едва была жива и полностью обескровлена. Но железной рукой все вновь было обречено на неизменность. [illegible] развитие после войны шло очень тяжело, если не сказать, прозябало. Надо было что-то делать...

Хорошие перспективы открылись в годы «оттепели», после сентябрьского Пленума ЦК КПСС в 1953 году. Он сформировал ряд решений, ожививших деревню, вдохнувших в него жизнь и надежду. Это сразу отразилось на темпах роста производства сельхозпродукции, поскольку исходный уровень был крайне низким. Но, созидая одной рукой, Н.С.Хрущев второй рукой сам же и разрушал созданное, навязывая не непродуманные и неприемлемые меры. Во второй половине десятилетнего его руководства темпы роста резко упали, страна встала на путь импорта крупных партий зерна.

Новые возможности оздоровления аграрного сектора открылись после мартовского Пленума ЦК КПСС в 1965 году. Многое тогда было сказано правильно. Были резко увеличены инвестиции в сельское хозяйство, в больших размерах проводились химизация, мелиорация, началась индустриализация производства. Но безудержное огосударствление и гигантомания существенно снизили эффективность капитальных вложений. Темпы роста производства, возросшие после 1965 года, снова упали.

В результате реализации политики сельского строительства и районной планировки стали стремительно исчезать небольшие поселения. Деревни начали обезлюдевать и запустевать. По переписи населения в 1959 году было 294 тысячи сельских поселений, а в 1989-м – уже 152 тысячи, т.е. почти половина.

Нет оснований говорить о расцвете сельского хозяйства в СССР и в период с 1970-го по 1993 год по сравнению с Европой. К примеру, за эти годы в России гектарная урожайность зерновых возросла с 13,6 до 14,9 центнера, в Беларуси – с 15,0 до 26,8. В Германии же за этот период урожайность увеличилась с 33,4 до 65 центнеров, при этом затраты на единицу продукции у них были в 2,6–3,3 раза ниже, чем у нас.

К началу перестроечного периода коренным образом изменить ситуацию в аграрной сфере было уже трудно.

В Беларуси, бесспорно, многое сделано по сохранению и развитию сельского хозяйства. Теперь наша страна уже как самостоятельное государство стоит перед выбором, необходимо реформировать сельское хозяйство. При этом исторический опыт нельзя не учитывать. А этот опыт говорит, что нужны продуманные, без «гигантомании», системные, не половинчатые, опирающиеся на частную собственность и сбалансированную макроэкономическую среду хозяйствования, волевые и настойчивые, умеренные по скорости проведения реформы.

Финансовое оздоровление хозяйств: возможен ли конкурс бизнес-планов?

«Планы, может, и бесполезны, но планирование обязательно».
Д.Эйзенхауэр

Представленные предложения не новы. Они обоснованы и предложены мной еще в 2001 году. С ними тогда ознакомился и президент страны А.Г.Лукашенко. Резолюция его была следующей: *«Новицкому. К исполнению»*. Однако все затем было приостановлено... Тогда же и в «Белорусской ниве» была опубликована статья «Бизнес-план по конкурсу», вызвавшая общественный резонанс. Очевидно, сейчас целесообразно вернуться к этим предложениям. Особенно, если учесть, что А.Г.Лукашенко, посещая осенью 2010 года фермерское хозяйство Михаила Шрубы, сказал, что и впредь будет поощряться приватизация хозяйств под сильную личность, доказавшую свою способность обеспечить экономически эффективное производство и достойную заботу о трудовом коллективе.

Предлагается для проблемных убыточных хозяйств (их можно дифференцировать по финансово-экономическому состоянию) объявить конкурс бизнес-планов по их финансовому оздоровлению и выводу на нормальный уровень хозяйствования. Срок реализации бизнес-плана – три года. Конечно, сразу же возникает вопрос: кому это сейчас надо, где те наивные люди, которые возьмутся в нынешних макроэкономических, организационных и управленческих условиях, «добитости» многих конкретных хозяйств разрабатывать и реализовывать какой-то там бизнес-план?

Думаю, чтобы такие люди нашлись, нужны очень серьезные личные побудительные мотивы и ясно изложенные государством условия, в которых придется реализовывать бизнес-план.

Заинтересовать и привлечь достойных конкурсантов можно, по моему мнению, следующим образом: в случае успешной реализации бизнес-плана, выведения хозяйства по финансовым и производственным показателям на прогнозируемый, обозначенный в плане уровень, команда разработчиков и реализаторов бизнес-плана получает право на приватизацию хозяйства (или получение пакета акций, к примеру, 35% или большей доли в уставном фонде и др.) или вообще становится собственником, хозяином предприятия. Условия конкурса, «правила игры» должны быть описаны (регламентированы) государственным правовым актом. *(Эта статья – конечно же, не детализированный план конкретных действий, а прежде всего «информационное поле», идея, возможный вектор действий. Ее конкретизация, переложение на язык целей и задач – это последующая работа целого коллектива в случае принятия подхода.)*

Безусловно, каждый решившийся взяться за это нелегкое, рискованное, но весьма заманчивое и перспективное дело задумается, во-первых, о гарантиях, во-вторых, о благоприятности макроэкономических условий, в которых придется реализовывать бизнес-план. Чтобы претенденты поверили, что это «всерьез и надолго», несомненно, необходимы правовые акты, административная воля, ясная позиция президента, информационное обеспечение и поддержка местных властей.

Необходимы прецеденты уже в ближайшее время. Можно отдать по определенным правовым процедурам в собственность руководителям и специалистам лучшие, экономически состоятельные хозяйства в каждом районе как пример для подражания другим. Эти люди (руководители и специалисты хозяйств) десятилетиями доказывали свое умение быть эффективными руководителями, а следовательно, собственниками. Таких людей мало, и их надо особо ценить. Премьер-министр Англии Маргарет Тэтчер, проводя в 1980-е годы приватизацию крупных гособъектов, пришла к выводу, что *«самое сложное в проблеме приватизации – найти достойного собственника»*.

По моему мнению, председательский корпус крупных товарных хозяйств сейчас слаб, намного слабее, чем в 1980-е и даже в 1990-е годы. Многие сильные руководители либо ушли из села, либо собираются уходить, либо «не доехали» до него. Вернуть их туда может только серьезный, перспективный интерес и выгода. А в данном случае интерес будет, так сказать, судьбоносный для человека и его семьи, для его внуков и правнуков. Роль сильного, по-настоящему мотивированного руководителя и его команды всегда была и будет решающей в эффективном производстве. Несомненно, в нынешних условиях усложнит работу и чрезмерный гигантизм крупных товарных хозяйств.

В Беларуси в последние 25 лет ежегодно получали высшее аграрное образование примерно тысяча человек. Следовательно, сейчас имеется до 25 тысяч специалистов-аграриев в возрасте 25–50 лет. Потенциально есть кому претендовать. Будущих хозяев, на мой взгляд, нужно искать для 1200–1300 хозяйств. Следовательно, нужно найти всего лишь 1300 настоящих аграрных лидеров на всю Беларусь. А они сформируют свои команды. Но до сих пор мы таких лидеров на предлагаемых условиях, надо признать, даже и не искали.

Конечно, макроэкономические условия должны позволять реализовывать бизнес-план в условиях стабильных финансов, оптимального ценообразования, квотирования производства, разумной свободы реализации продукции (после выполнения государственных квот остальное реализуется свободно), списания безнадежных долгов, возможности льготных кредитов, достаточных госпреференций и другого.

Хозяин-собственник и наемные работники

«Власть теряет все свое очарование, если ею не злоупотреблять».
Поль Валери

Заслуживает углубленного осмысления вопрос о реакции простых работников и их будущей социальной защищенности в случае появления на селе крупных собственников-землевладельцев. Не возникнут ли массовые недовольства, не дестабилизирует ли такая приватизация ситуацию на селе? Опыт показывает, что, например, присоединение СПК к фермерскому хозяйству М.Г.Шрубы или создание ЧУПов произошло в условиях социального спокойствия.

Безусловно, надо заранее четко описать права и обязанности будущего собственника-хозяина. Это не «пан». Он ответственен наряду с государством за порядок и жизнь людей на территории хозяйства, за использование земельных ресурсов по назначению. Надо провести подготовительную работу через СМИ, объяснить простым работникам, сформировать у них понимание, что появится не «буржуй», «капиталист-эксплуататор» трудящегося народа, а руководитель нового типа, сильный и умный управленец, личность, обладающая современной мировоззренческой культурой, которой государство строго очертило рамки, «коридор прав и обязанностей». Конечно, собственник должен иметь объем прав, позволяющих ему быть полноценным хозяином. Излишние ограничения только профанируют и погубят идею именно такой приватизации.

Усилия социологов, экономистов, правоведов-аграрников должны быть направлены на составление гармоничного комплекса прав и обязанностей будущего собственника, на прогнозирование и разработку мер социальной защищенности жителей села, самих процедур приватизации.

Среди претендентов, пожелавших стать собственниками и участвовать в конкурсе, должен быть проведен объективный, не протекционистский, не коррумпированный отбор. Это должна быть открытая, прозрачная процедура. На первых порах им, будущим хозяевам, придется чем-то жертвовать во имя лучшего будущего.

Почему необходим именно такой вариант приватизации?

Важнейшее преимущество – сохраняется крупное товарное производство, хозяйственная целостность производственной инфраструктуры села.

Не прекращается производственный процесс, не будет периода дестабилизации и ухудшения нынешнего положения дел.

Все осуществляется не бессистемно, не хаотично, государство держит процесс под контролем, в механизм приватизации заложен потенциал повышения экономической эффективности приватизируемых объектов. Конечно, остается открытым вопрос: как урезонить белорусских чиновников, чтобы они не только не «лезли» в технологические процессы, закупки, тендеры, но и не искали свою личную выгоду в возможных преобразованиях? Главное – многое отдать на откуп закону, а не чиновнику.

П.А.Столыпин писал: «*…отсутствие собственности и создает все наше неустройство. Природа вложила в человека некоторые врожденные инстинкты, как-то: чувство голода, половое чувство и т.п. И одно из самых сильных чувств этого порядка – чувство собственности. Нельзя любить чужое наравне со своим и нельзя обхаживать, улучшать землю, находящуюся во временном пользовании, наравне со своей землей. Искусственное в этом отношении оскопление нашего крестьянина, уничтожение в нем врожденного чувства собственности ведет ко многому дурному и главное – к бедности. А бедность по мне – худшее из рабств…*»

Многие из современных специалистов считают, что в руках собственника отдача от ресурсов уже через 2–3 года возрастет на четверть, даже если серьезно не изменятся макроэкономические условия, а при адекватных собственнику экономических условиях хозяйствования продуктивность белорусского АПК значительно возрастет.

Конечно, неизбежно встает вопрос социальной справедливости, нарушения принципа равенства, к которому мы так привыкли, который нам так близок и понятен. Но уже давно пора начать говорить, что люди равны, к примеру, перед законом, перед правом на получение бесплатного медицинского обслуживания, образования и т.д. Но люди не равны по своим врожденным наследственным качествам: энергичности, силе ума, работоспособности, волевым качествам и т.д. Люди не равны по биологическим потенциям. Следовательно, они неизбежно должны быть неравны по доходам, успехам в карьере и т.д.

Реализация предлагаемой модели приватизации на селе вдохнет в АПК мощный импульс, направит туда самую главную энергию – энергию человеческой предприимчивости, заинтересованности и усердия. При наличии в достатке этого вида энергии, скажем так, катализируется техногенная энергия (топлива, удобрений, пестицидов, почвы и т.д.). Только при хозяине-собственнике и необходимых макроэкономических условиях субъекты хозяйствования на земле могут стать самодостаточными, самоорганизующимися, экономически эффективными системами. Из центра, из Минска, Гомеля и т.д. этого не достичь. Что бы мы ни предлагали – убыточные хозяйства таковыми и останутся.

По-моему, мы упустили время и продолжаем терять его и сегодня. 15–20 лет назад при том состоянии хозяйств, при той кадровой ситуации, уверен, желающих участвовать в конкурсе бизнес-планов было бы предостаточно. Однако убежден, что предлагаемый вариант приватизации еще не поздно начать реализовывать и сейчас.

ДЫПКУР'ЕР

Увага! Зачынена!

22 чэрвеня польскія консульствы ў Мінску, Брэсце і Гродне не будуць прымаць дакументы на візы. Прычына – арганізацыйна-тэхнічныя работы, звязаныя з увядзеннем біяметрычнага збору дадзеных.

Нагадаем, што з 23 чэрвеня, падаючы дакументы на атрыманне шэнгенскай візы, беларусы павінны будуць здаць адбіткі пальцаў, а фотаздымкі адсканіруюць. Нават калі заяўнік едзе за мяжу ў складзе турыстычнай групы, яго прысутнасць пры падачы дакументаў будзе абавязковая.

Біяметрычныя звесткі заяўнікаў будуць захоўвацца ў агульнай базе на працягу 59 месяцаў. Іх могуць паўторна выкарыстоўваць пры падачы новых заявак на візу. Прычым гэтыя адбіткі будуць даступны ў кожнай амбасадзе або консульстве краін Шэнгена.

Не падаваць заяўкі могуць толькі тыя, хто фізічна няздольны гэта зрабіць – напрыклад, тыя, хто не мае пальцаў. Калі ў чалавека менш за 10 пальцаў, то здымаюцца адбіткі ўсіх наяўных. Калі часова немагчыма зняць адбіткі (напрыклад, пры пераломе пальцаў альбо заяўнік знаходзіцца ў шпіталі), то заяўніка могуць вызваліць ад гэтай працэдуры. Але ён мусіць яе прайсці пры наступнай заяве на візу.

ЧУЛІ?

У Полацку знайшлі пячатку Еўфрасінні Полацкай

Старадаўнюю актавую пячатку Еўфрасінні Полацкай знайшлі на раскопках Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра ў Полацку, паведамілі ў райвыканкаме.

Напярэдадні святкавання Дня горада Полацка і Дня памяці прападобнай Еўфрасінні Полацкай (5 чэрвеня) на тэрыторыі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра завяршыліся раскопкі, у якіх бралі ўдзел як беларускія, так і расійскія навукоўцы. Яны і выявілі ўнікальны артэфакт.

«Гэтая знаходка чарговы раз падкрэслівае значнасць і ўнікальнасць асобы святой і сведчыць пра тое, што манастыр у XII ст. быў не толькі буйным духоўным і культурным, але і грамадска-палітычным цэнтрам, дзе актыўна вялася перапіска, і Еўфрасіння Полацкая змацоўвала дакументы сваёй пячаткай", – падкрэслілі ў райвыканкаме.

Плануецца, што знаходка будзе дададзена ў экспазіцыю сценапісу, знятага са сцен Спаса-Праабражэнскага храма ў Мастацкай галерэі Полацка.

Прэзентацыя артэфакта адбудзецца ў Мастацкай галерэі 4 чэрвеня ў 10.00. Пячатка будзе экспанавацца тут на працягу чатырох дзён (4, 5, 6, 7 чэрвеня).

ЭКАНОМІКА

«Гродна Азот» не дачакаўся інвестара

Не дачакаўшыся інвестара, ААТ „Гродна Азот" уласнымі сіламі пачало працы па мадэрнізацыі азотнага комплексу.

Плануецца, што вынікам стане будаўніцтва новых цахоў аміяку і карбаміду, а таксама вадароднай устаноўкі. Уваход інвестара можа адбыцца ў любы момант, але пакуль жадаючых набываць акцыі прадпрыемства на ўмовах, якія прапаноўвае дзяржава, няма. Прадугледжваецца, што інвестар павінен будзе фінансаваць будаўніцтва новага азотнага комплексу да канца 2019 года.

Нежаданне інвеставаць у адно з самых вялікіх і паспяховых прадпрыемстваў краіны, на думку намесніка старшыні Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў Сяргея Антусевіча, выклікана як коштам акцый, так і эканамічнай сітуацыяй у Беларусі:

– Заводу 50 год, апошняя буйная рэканструкцыя ці будаўніцтва адбываліся напрыканцы 90-х гадоў мінулага стагоддзя, – кажа Антусевіч. – Натуральна, што там ёсць пэўныя ўкладанні і абнаўленні асноўных сродкаў. Тым не менш гэта састарэлыя тэхналогіі, гэта старая вытворчасць – ніхто не будзе плаціць тыя кошты, не захоча плаціць за састарэлае абсталяванне ці вытворчую пляцоўку.

Стартавы кошт пакета акцый адкрытага акцыянернага таварыства „Гродна Азот" складае 414 мільёнаў долараў. Летам мінулага года конкурсны адбор на ўдзел у прыватызацыі прадпрыемства не адбыўся ў сувязі з адсутнасцю жадаючых у ім удзельнічаць. Раней паведамлялася, што зацікаўленасць да набыцця пакета дзяржаўных акцый праяўлялі расійскія кампаніі.

Народная Воля http://www.nv-online.info 2 ЧЭРВЕНЯ 2015 г.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Не было б бяды ў суседа – шчасця б ты свайго не зведаў

Згодна з сацыялагічнымі даследаваннямі, праведзенымі Беларускай аналітычнай майстэрняй, беларусы адчуваюць сябе шчаслівымі, бо лічаць, што ў суседзяў (перш за ўсё ўкраінцаў) значна горш.

Хрысціна цэлы дзень панура
Хадзіла па сваім двары,
Бо сёння ўранку здохла кура
(Курэй было дагэтуль тры).
Ну як не бедаваць бабулі?
Хрысціне куры нестае,
Бо яйкі, што ні дзень, як кулі,
Ляцелі ў седала з яе.
Ці клюнула зярнятка з дустам,
Ці злыдзень нейкі прыдушыў,
Ды куры ўжо капец. І пуста
Было ў Хрысціны на душы.
Цяпер бабулі свет не мілы,
Чужы як быццам гэты свет,
Хоць джгай самохаць да магілы,
Каб легчы там, дзе ўлёгся дзед.
Няшчаснай самай адчувала
Сябе сярод людзей сяла.
І днём старой патолі мала,
Заснуць і ноччу не магла.
Назаўтра да Хрысціны з рання
Прыбегла са сваёй бядой
Суседка-аднагодка Маня,
Загаласіла – “ай” ды “вой”.
У хлеве не прыткнула дзверы,
Дык уначы кабанчык збег.
Нашкодзіў злыдзень да халеры
(За гэта й прыкалоць не грэх).
Парсюк усё на агародзе
Перакапаў лычом, таму
Не ўзыдзе бульба.
Жах дый годзе!
Не будзе бульбы на зіму.
Яшчэ ж нягоднік гэты глебу
Перавярнуў і на градзе.
Дзе возьме кропу на патрэбу,
І агуркоў узяць ёй дзе?
Калі паслухала Хрысціна
Пра Манін боль, дык у старой
З душы апала павуціна,
Крыху палепшыўся настрой.
Хоць непрыемнасць у бабулі
І куру бедную шкада,
Без бульбы Маня, без цыбулі,
А гэта большая бяда.
У полудзень пайшла ў адведкі
(Адведкі ледзь не кожны дзень)
Хрысціна да другой суседкі,
А тая ходзіць, быццам цень.
Спыталася:
– Ты нездарова?
Чаму, як хмара, сёння ты?
– Здарова... Ды мая карова
Вось-вось адкіне капыты.
Пусціць на мяса бедачыну
Параіў мне ветэрынар.
Бяда прыгорбіла жанчыну,
Ад слёз азыз суседкі твар.
Хрысціна да яе ў спагадзе,
А як ступіла за парог,
Дык радасць у яе паглядзе
Любы сустрэчны ўбачыць мог.
“Я, – разважала Хрысця, – здуру
Пашкадавала тых яец,
І думкі мучылі пра куру,
А тут карове, бач, капец...”
Амаль зусім ужо пад вечар
Душа не ныла ад пакут:
Да цэнтра вёскі, як на веча,
З усіх канцоў збягаўся люд.
У састарэлага Кандрата,
Які ўжо тры гады бабыль,
Гарэла, быццам свечка, хата
(Сказаць па праўдзе, хата – гніль).
“Магчыма, – думала Хрысціна, –
Хтось падпаліў яе са зла...”
Як ні тушылі, ды хаціна
Згарэла, як касцёр, датла.
Цяпер няма ў Кандрата выйсця:
Падацца беднаму куды?
– І ворагу, – сказала Хрысця, –
Не пажадаць такой бяды.
І жыць Хрысціне люба-міла,
З душы праменіцца святло!
А пра сваю бяду забыла,
Як быццам куры й не было.

* * *

І ўжо ніколі больш не стане
Хрысціна наракаць на лёс,
А як памрэ суседка Маня –
Ад шчасця скочыць да нябёс.

НЯВЫДУМАНАЯ ГІСТОРЫЯ

Іванава паляванне

Справа была позняй восенню. Іван вяртаўся дамоў з палявання, ...

...

Анатоль ШАРАЕЎ.

ТАК ДУМАЮ

Хвароба не павінна стаць нормай у грамадстве

...

Уладзімір ШУЛЯКОЎСКІ, лаўрэат літаратурнай прэміі імя Васіля Віткі.

КРИК ДУШИ

Ужас, а не новоселье!







Трубы крепятся к стене жилой комнаты.

...

РУП «Главгосстройэкспертиза»... выполнило оценку отдельных разделов строительного проекта... По результатам оценки были выявлены отдельные отступления... от решений архитектурного проекта... При этом принятые технические решения соответствуют требованиям ТНПА, в том числе по защите от шума, дей-...

...невозможно. А ведь еще нужно в течение 20 лет выплачивать кредит, отдавая ежемесячно на его погашение целую зарплату. Положение чудовищное. Как тут быть, что делать?!

С уважением – Светлана ФАМИНСКАЯ.
Минск.

От редакции

Публикуя это письмо, мы все же надеемся, что оно станет предметом серьезного, объективного разбирательства в Мингорисполкоме и соответствующих ведомствах. Если власть на каждом шагу заявляет, что у нас социально ориентированное государство, что забота о человеке – превыше всего, то крик души С.Фаминской и ее детей должен быть услышан. И все сделано для того, чтобы их законные требования были реализованы и жить люди стали в нормальных условиях.

Народная Воля http://www.nv-online.info 2 ЧЭРВЕНЯ 2015 г.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Приостановлено расследование дела об убийстве Деда Хасана

Московские следователи приостановили расследование уголовного дела об убийстве одного из самых влиятельных «воров в законе» Аслана Усояна по кличке Дед Хасан. Более чем за два года работы следователи не смогли собрать доказательств, чтобы предъявить кому-либо обвинения в совершении этого преступления.



...

НУ И НУ!

Обиратели русских земель

...

БОЛЬШАЯ ПОЛИТИКА



Китайская орда

Китаю выгоден поворот во внешней политике России, и он не даст развиваться российской экономике, считает бывший советский разведчик, однокурсник Владимира Путина, а ныне американский финансовый аналитик Юрий Швец. Нам его текст показался чрезвычайно интересным и важным, поскольку и Беларусь видит в Китае перспективного партнера. Хотя многие не понимают, чем вызван интерес Поднебесной к нашему региону.



Москва совершает стратегический разворот в сторону Китая. В свое время московские князья упали под Орду, теперь “кремлевские” ложатся под “пекинских”. Очередной стратегический пердимонокль будет иметь тяжелые последствия для ...

...нелюбимую падчерицу Кремля. В результате значительная часть разведывательных функций за рубежом плавно перешла в ведение ФСБ, которая во времена, когда ею руководил Путин, была “усилена” операми территориальной управы КГБ ...

...китаец, когда мы сравнивали уровень жизни двух стран.

Его рассказ о быте китайских дипломатов и журналистов в Вашингтоне поразил меня до глубины души. Его семья в составе трех человек жила на его зарплату в размере – вни-...

«Путину писали, что переориентация на Китай – это величайшая глупость. Но Путин разведку не любит. Это глубоко интимное чувство»

«“Кремлевские” теперь будут ходить под “пекинскими”, и отношения между ними будут напоминать отношения между вассалом и сюзереном»

«За то, что делает с Россией кооператив “Озеро”, в Китае расстреливают»

...

Юрий ШВЕЦ, «Бульвар Гордона».

СЛЫШАЛИ?



В Туркменистане могут продлить срок полномочий президента

...

Для сведения

...

Народная Воля http://www.nv-online.info 2 ЧЭРВЕНЯ 2015 г.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Над чым працуе Дудараў?

Убачыў у календары, што хутка, 6 чэрвеня, дзень нараджэння Аляксея Дударава, яму спаўняецца 65 гадоў. Што цяпер піша вядомы драматург, чым займаецца? Даўно не чуў пра яго навін.

Канстанцін АЛЯКСЕЕЎ, Мінск.



Аляксей ДУДАРАЎ:

«Зараз у тэатр баюся хадзіць...»

– Над чым я зараз працую? Адкажу коратка: над сабой. Я не люблю гаварыць аб планах, распавядаць пра няскончаныя справы. Будзе вынік – самі ўбачыце. Вядома, пісьмовы стол па-ранейшаму мой «станок», драматурга цяжка ўявіць на пенсіі. Хоць веры ў тое, што напісанае можа змяніць свет, у мяне даўно няма. Гэта пры савецкай уладзе лічылі, што п'еса «Сталявары» можа паўплываць на прадукцыйнасць працы на заводах. Я ў творчасці такіх задач не стаўлю.

Пра што мару? З'ехаць на дачу пры першай магчымасці. А вось па тэатрах хадзіць не хочацца... І даўно. У апошні час я прыходжу туды толькі для таго, каб павіншаваць з юбілеямі вялікіх акцёраў, сваіх сяброў – Расціслава Янкоўскага ў Рускім тэатры, Сяргея Жураўля ў Купалаўскім. Зараз у тэатр баюся хадзіць. Шчырай размовы ад цябе ўсё роўна не чакаюць. Пасля прэм'еры чакаюць хвалы. А сказаць у большасці выпадкаў няма чаго. Так, пацісnуць плячыма...

Я настроены на іншы тэатр, канцэптуальнае мастацтва я ніколі не разумеў. Я хачу адчуваць ад спектакля пачуцці спагады, цеплыні, увагі. Мне здаецца, што большасць гледачоў чакаюць ад мастацтва таго ж. А ім імкнуцца падсунуць, кажучы па-руску, "развлекуху"... Зараз у тэатрах імкнуцца публіку здзівіць. А яна ўсё не здзіўляецца... Таму што на самай справе чалавек ва ўсе часы чакае ад іншага чалавека разумення і любові. А не экстравагантных дэкларацый.

Дзе наша Аксана?

Як развіваецца кар'ера нашай опернай зоркі Аксаны Волкавай? Якія вяршыні скарыліся ёй пасля дэбюту ў знакамітай нью-ёркскай «Метраполітэн-опера»? Нядаўна, дарэчы, оперу «Яўген Анегін», у якой спявалі Волкава і Нятрэбка, паказалі ў запісе па канале «Культура». А дзе наша Аксана?

Надзея АКСАК, г.Мар'іна Горка.



Аксана ВОЛКАВА:

«Сцэна «Ла Скала» прымушае мяне трапятаць!»

– Зараз я далёка ад Мінска. Я ў Італіі, у міланскім тэатры «Ла Скала». Так, гэта вялікая сцэна прымушае мяне, шчыра кажучы, трапятаць, хоць за спінай ужо немалы вопыт замежных выступленняў. Але – італьянская публіка, гісторыя тэатра, уся атмасфера! Трэба выкладвацца на сто працэнтаў, і гэта выдатна.

Я працую над партыяй Лолы ў оперы Масканы «Сельскі гонар». Прэм'ера прызначана на 12 чэрвеня. Плануецца пяць спектакляў. Дырыжыруе маэстра Карла Роцi. Мая партыя невялікая, але вельмі для мяне адказная, таму што я буду спяваць у адной камандзе з Элінай Гаранча, опернай зоркай, знакамітасцю, яе завуць цяпер найлепшым лірычным меццасапрана свету. Яна ў спектаклі будзе выконваць партыю Сантуцы. Прызнаюся, я вельмі хацела атрымаць гэты кантракт, марыла працаваць на адной сцэне з гэтай вялікай спявачкай і доўга нават не хацела казаць блізкім таварышам аб кантракце ў «Ла Скала» – баялася, каб нічога не перашкодзіла гэтым планам здзейсніцца.

Опера Масканы «Сельскі гонар» – гэта гісторыя сіцылійскай страсці, невыноснай, усёпаглынальнай любові. Яна напісана ў канцы XIX стагоддзя і да гэтага часу ставіцца ў лепшых тэатрах свету. Цікава, што спачатку мой артыстычны лёс даў мне магчымасць праспяваць менавіта партыю Сантуцы з «Сельскага гонару». І гэта было ўсяго толькі месяц таму ў Іспаніі, у філарманічнай зале Мадрыда "Аўдыторыя Нацыяналь". А зараз у «Ла Скала» я буду спяваць Лолу – удачлівую саперніцу Сантуцы. Так бы мовіць, зведаю два канцы арэляў кахання: няшчаснага і шчаслівага. Драматычна і вакальна я, вядома, больш люблю партыю пакутніцы Сантуцы. Але зараз у «Ла Скала» мне трэба будзе пабываць разлучніцай Лолай – грацыёзнай, прыгожай і бязлітаснай.

Алена МАЛОЧКА.

СЛЫШАЛИ?

С дебютом!




Популярный белорусский певец и ведущий Георгий Колдун исполнил роль капитана Грея в мюзикле «Алые паруса» Максима Дунаевского.

Юбилейный, 25-й, спектакль, в котором дебютировал артист, показали публике в московском театре «Русская песня» в минувшее воскресенье.

Первую постановку «Алых парусов», которую часто называют «антимюзиклом», осуществили в 2010 году на сцене Российского академического Молодежного театра режиссер Алексей Бородин. Акцент в спектакле делался на сюжете, а главные роли исполнили драматические актеры.

Композитор Максим Дунаевский создал новую редакцию мюзикла в 2011 году, в него вошли 27 вокальных номеров, а музыку Дунаевский написал буквально за три дня.

ВУНДЕРКИНДЫ



Девятиклассник создает программы на уровне профессионалов

*На Республиканском конкурсе «ТехноИнтеллект» полочанин **Дмитрий ВАЛЬКОВИЧ** оказался в тройке лучших.*

Учащийся полоцкой гимназии №2 увлекается программированием не первый год. С пятого класса большую часть своего времени парень проводит за компьютером, поэтому и успех в конкурсе был ожидаемым. В номинации «Информационные системы и технологии» Дима был награжден дипломом III степени.

– Каждому участнику нужно было написать и презентовать проект, – рассказывает гимназист о прошедшей научной конференции. – *Я написал свой сервер, то есть создал программу, которая позволяет раздавать файлы. Такая схема дает множество преимуществ, начиная от обычной рассылки школьного расписания на телефон и заканчивая шифрованием данных в государственной сфере.*

По словам молодого программиста, самое сложное в работе – определиться с тематикой. На придумывание проекта иногда уходит больше времени, чем на его подготовку. К тому же тематика должна быть оригинальной и интересной.

Условия в гимназии позволяют учащимся развиваться и добиваться успеха в конкретной деятельности. Об уровне подготовки программистов Дима отзывается хорошо.

– У нас три компьютерных класса, высокоскоростной интернет, всегда есть нужная литература, – говорит девятиклассник. – *Условиями я доволен. В работе всегда помогают как преподаватели, так и учащиеся, то есть ребята из 11-го класса, а я уже что-то могу подсказать ребятам помладше.*

Свое будущее парень видит в IT-сфере, которая сегодня популярна и прибыльна. Первоначальные данные у гимназиста уже есть, сейчас вплотную занимается изучением английского языка, без которого программисту никуда. Как признается Дима, ему больше по душе точные науки, чем гуманитарные. Несмотря на успехи в программировании, об остальных предметах не забывает – впереди экзамены за девять классов.

По словам гимназиста, 8–10 часов в день за компьютером – это его обычный режим. Интересуюсь у Димы, остается ли свободное время.

– Главное – грамотно спланировать свой день, – говорит девятиклассник. – *Я работаю за компьютером, играю в баскетбол, встречаюсь с друзьями. У меня нет каких-то особых ограничений.*

Вундеркиндом Дима себя не считает и в компании друзей о программировании говорит мало. Признается, что как бы ни любил свою работу, иногда полезно на время отвлечься и подумать о чем-то другом.

– Я не вундеркинд, а просто человек, который много времени тратит на свою профессию, – рассказывает Дима. – *Несколько часов за компьютером я провожу в гимназии, потом продолжаю работу дома. Это, конечно, не базовый курс информатики – у меня другие задания.*

Еще два года Диме учиться в гимназии, но над выбором университета он уже задумывается. Признается, что это будет вуз Минска или Санкт-Петербурга, где уже учатся выпускники полоцкой гимназии. Хотя к университетскому диплому относится спокойно; по мнению гимназиста, успех в профессии зависит прежде всего от личного трудолюбия.

– Уровень, который на сегодняшний день показывает Дима, более чем высокий, – присоединяется к разговору учитель информатики **Александр Цегельников.** – *В университете у него не будет возникать сложностей в учебе.*

В интеллектуальных конкурсах и соревнованиях Александр Владимирович вместе с гимназистами участвует регулярно. Признается, что результатами своих подопечных доволен.


– Дима очень трудоспособный парень, которого нужно только скоординировать, а дальше он уже будет работать самостоятельно, – говорит учитель информатики. – *Летом будем заниматься поиском новых проектов, осенью, а может, и того раньше начнется подготовка к очередному конкурсу.*

По словам Александра Цегельникова, нужно следить за тем, чтобы учащиеся не перерабатывались, все-таки они немало времени проводят за компьютером. Также очень важным фактором для успеха является поддержка и понимание со стороны родителей. Как признается Дмитрий Валькович, его родители хоть и не программисты, но полностью одобряют увлечение сына.

– Мои родители в сфере связи работают, – уточняет Дима. – *А вот тетя и дядя – программисты. Так что у нас в каком-то смысле династия.*

Роман ВАСЮКОВИЧ.
г.Полоцк.

СІТУАЦЫЯ



Хто выратуе скарбы айца Надсана?

Яшчэ ў 1971 годзе айцец **Аляксандр Надсан** (пазней ён стаў апостальскім візітатарам для беларусаў-каталікоў у замежжы) заснаваў у Лондане Бібліятэку імя Францыска Скарыны. Кніжніца налічвала больш за 40 тысяч выданняў. Сярод іх Статут ВКЛ, першадрукі зборнікаў Багдановіча, Гарэцкага і Янкі Купалы, два слуцкія паясы, калекцыя манет ВКЛ і іншыя каштоўнасці. У "Скарынаўку", якая стала адным з духоўных і інтэлектуальных цэнтраў беларускай эміграцыі, прыязджалі працаваць нават даследчыкі з БССР, бо шэраг кніг, газет і часопісаў, якія захоўваліся ў спецхране, знаходзіліся ў Надсана ў вольным доступе.

Пасля смерці айца Аляксандра існаванне бібліятэкі апынулася пад пагрозай. Па інтэрнэце папаўзлі плёткі, што асобы, набліжаныя да Надсана, хочуць прадаць бібліятэку. Лінгвіст **Джым Дынглі**, сябра айца Надсана, што завітаў у Мінск на 6-ы Міжнародны кангрэс беларусістаў, аспрэчыў гэту інфармацыю. "Бібліятэка мае статус дабрачыннай арганізацыі. Згодна з англійскім заканадаўствам, будынак і ўсё, што ў ім знаходзіцца, з'яўляецца ўласнасцю сяброў апякунскай рады, – падкрэсліў Дынглі. – Усе яны нясуць адказнасць за будынак і калекцыю. Таму продаж немагчыма ажыццявіць па законе".

Адначасова Джым Дынглі акрэсліў шэраг праблем, якія трэба вырашыць. Іначай "Скарынаўка" можа спыніць існаванне. Першая праблема – амаль поўная адсутнасць чытачоў. Як адзначыў Дынглі, сябры апякунскай рады плануюць дзяжурыць у памяшканні па чарзе па суботах. Тады "Скарынаўка" будзе адчынена па чатыры гадзіны. У іншыя дні – паводле папярэдніх дамоўленасцяў. Дарэчы, гэта дазваляе як мінімум ахоўваць каштоўную калекцыю. Бо пэўны час таму "Скарынаўка" набыла "Пяцікніжжа", выдадзенае Францыскам Скарынам. Як прызнаўся Дынглі, гэтае выданне знікла: "Дакладна ведаю, хто скраў. Але не маю доказаў. Упэўнены, што цяпер яно знаходзіцца ў Маскве".

Другая праблема – калекцыі бібліятэкі павінны быць даступныя ва ўсім свеце. Пакуль на сайце ўстановы можна прачытаць у электронным выглядзе толькі два часопісы. У планах – пашырэнне іх колькасці, а таксама стварэнне электроннага каталога.

Адна з таямніц скарбаў Надсана – архіў. "Ніхто дакладна не ведае, што ў ім знаходзіцца", – прызнаецца Джым Дынглі. На наступным пасяджэнні апякунскай рады будзе вырашацца, перадаваць архіў у Беларусь або не.

Нарэшце, звыклая праблема для любой установы культуры – адсутнасць фінансавання. Падчас апошняга візіту ў Беларусь адзін з сяброў апякунскай рады проста набываў кнігі і прывозіў іх у Лондан. Як заўважыў Дынглі, трэба матэрыяльна заахвочваць аўтараў, каб яны перадавалі свае кнігі ў Лондан. Каб знайсці грошы, літаратуразнаўца **Адам Мальдзіс** прапанаваў арганізаваць стажыроўку ў "Скарынаўцы" для студэнтаў беларускіх дзяржаўных універсітэтаў (у тым ліку БДУ). Але сябры апякунскай рады прапануюць здаваць частку першага паверха кватарантам. Такім чынам можна будзе атрымліваць да 700 фунтаў стэрлінгаў у месяц (каля 1 тысячы долараў). Ці дапамогуць гэтыя захады для выратавання бібліятэкі Надсана, пакажа час. Зрэшты, калі ў айца Аляксандра запыталі перад смерцю пра лёс бібліятэкі, ён адказаў: "Я зрабіў што мог, далей вы старайцеся".

Максім ПЛОТНІКАЎ.

Даведка

Джым Дынглі – брытанскі лінгвіст-славіст, нарадзіўся ў Лідсе ў 1942 годзе. Працаваў у бібліятэцы Брытанскага музея і ва Універсітэце Рэдынга. Доўгі час узначальваў Англа-беларускае таварыства, рэдагаваў The Journal of Byelorussian Studies. Пераклаў на англійскую мову кнігу Уладзіміра Арлова «Краіна Беларусь» і раман Наталкі Бабінай «Рыбін горад».

ТРАГЕДЫЯ

...І плакалі людзі ў судзе

Учора быў вынесены прыгавор па крымінальнай справе, якая ўскалыхнула ўсю краіну. 34-гадовая Іна Зубовіч, забойца ўласнага сына, асуджана на 23 гады пазбаўлення волі.



Аб гэтай жудаснай трагедыі «Народная Воля» ўжо пісала. 28 студзеня памочніца выхавацеля ў дзіцячым садку Іна Зубовіч ўвесь дзень паіла свайго трохгадовага сына віном, а потым выкінула з акна. Хлопчык упаў на казырок пад'езда, атрымаў цяжкія траўмы, ад якіх памёр. У яго крыві было 1,9 праміле алкаголю.

Зубовіч распавядала ў судзе, што хацела сысці з жыцця разам з сынам і, каб супакоіцца перад здзяйсненнем суіцыду, купіла віна. Піла сама і паіла дзіця. *«Смяяўся, але потым заснуў. ... Дзіця ванітавала на падушку»*, – ад падрабязнасцяў, якія Іна распавядала ў судзе, плакалі прысутныя на працэсе і яна сама.

Сыходзіць з жыцця жанчына вырашыла з 12-га паверха, а не з 8-га, на якім жыла. Як патлумачыла: каб было напэўна, каб не застацца жывой, атрымаўшы цяжкія траўмы. Пакінула маці перадсмяротную запіску, узяла на рукі дзіця і адправілася на верхні паверх дома. Калі скінула сына, услед за ім не скокнула, а спусцілася ўніз. Патлумачыла суду: спадзявалася, што хлопчыка яшчэ можна выратаваць. *«Мне стала шкада, калі Улад зваліўся»*, – плакала яна.

У судзе жанчына не раз паўтарала, што не збіралася забіваць свайго сына, *«проста хацела пайсці разам з ім»*, і прасіла прысудзіць яе да вышэйшай меры пакарання – расстрэлу. Але для жанчын у Беларусі такога пакарання няма, вышэйшая мера – 25 гадоў пазбаўлення волі.

Падчас судовых слуханняў сталі вядомыя не толькі падрабязнасці гэтага жудаснага здарэння. Жанчына патлумачыла, што прымусіла яе пайсці на такі неймаверны крок.

Іна выхоўвала сына адна. Бацьку дзіцяці яна выгнала з дому, калі малому споўніўся ўсяго месяц. Як патлумачыла суду – з-за прыхільнасці грамадзянскага мужа да спіртнога. *«У мяне былі цяжкія матэрыяльныя ўмовы, дзіця ўвесь час хварэла, а мы жылі за кошт бабулі»*, – тлумачыла яна суду. Распавядала, што мела вялікі доўг – каля тысячы долараў. Грошы разам з сужыцелем пазычыла ў сяброўкі яшчэ ў 2011 годзе, а аддаваць не было чым. *«Маці папракала, што сядзім з дзіцем на шыі»*.

Што цікава, усе, хто ведаў Іну і выступаў у судзе, не сказалі пра яе ніводнага дрэннага слова.

«Нічога дрэннага сказаць не магу – вясёлы чалавек, заўсёды шмат сяброў», – так адклікалася аб Зубовіч сяброўка Аксана, якая пазычыла ёй грошы. Дарэчы, яна сцвярджала, што не патрабавала вяртаць доўг неадкладна, ведаючы, што Іна жыве бедна.

Сусед па тамбуры сведчыў, што Іну ведае даўно, але сем'ямі яны не сябравалі, у госці адзін да аднаго не хадзілі. Ахарактарызаваў жанчыну так: *«ціхая, спакойная»*. *«Узровень іх дастатку ніжэй сярэдняга,* – казаў у судзе сусед. – *Але кватэра чыстая... дзіця ахайнае»*.

Участковы ўрач-педыятр, выхавацелі дзіцячага садка, у які хадзіў Уладзік Зубовіч, казалі ў судзе, што Іна была клапатлівай маці і нават залішне апекавала сваё дзіця. І толькі маці Іны папракала яе ў тым, што здарылася. *«Іна, як я зразумела, працаваць не хацела*, – казала ў судзе маці Іны Марыя Міхайлаўна. – *Ёй хацелася жыць за чый-небудзь рахунак. Я яе ўтрымлівала, карміла, апранала. А ёй нідзе не падабалася, куды б яна ні ўладкоўвалася. ... Крэдыты брала, а я іх яшчэ выплачвала»*. Паводле слоў маці, і дзіця Іна нарадзіла, каб не працаваць.

Падчас судовых пасяджэнняў, дарэчы, высветлілася, што сястра Іны некалькі гадоў таму скончыла жыццё самагубствам. І сама Іна пяць гадоў таму таксама пагражала звесці рахункі з жыццём. Дарэчы, згодна з псіхолага-псіхіятрычнай экспертызай, абвінавачаная падчас здзяйснення забойства свайго сына не пакутавала на якое-небудзь расстройства і не знаходзілася ў стане афекту, таму магла ўсведамляць усе свае дзеянні і кіраваць імі.

Вердыкт суда – 23 гады пазбаўлення волі без канфіскацыі маёмасці. Прысуд можа быць абскарджаны на працягу 10 дзён. Але, мяркуючы па ўсім, аспрэчваць яго Іна Зубовіч не будзе.

КАМЕНТАРЫЙ ПСІХОЛАГА

Вольга АНДРЭЕВА:

«Я яе не апраўдваю. Але...»

– Што падштурхнула 34-гадовую жанчыну на такі страшэнны ўчынак? Галеча? Безвыходнасць?

– Сітуацыю, у якой апынулася Іна Зубовіч, трэба разглядаць у кантэксце агульнага сацыяльнага недабрабыту, які мы назіраем у Беларусі, – *каменціруе сітуацыю вядомы псіхолаг **Вольга АНДРЭЕВА**.* – Я яе не апраўдваю, але Іна, нягледзячы на свой узрост, была эмацыянальна няспелай. Менавіта ў сілу эмацыянальнай няспеласці людзі так дрэнна і хаатычна будуюць сваё жыццё: яна абрала безадказнага партнёра, улезла ў даўгі. Яна нарадзіла дзіця ад чалавека, які не мог быць для яе падтрымкай. Эмацыянальная няспеласць прывяла да таго, што яна заблыталася ў жыццёвых абставінах. А калі ў сям'і ці ў блізкім асяроддзі ёсць выпадкі суіцыду, то нярэдка для блізкіх, якія трапляюць у адчайнае становішча, суіцыд разглядаецца як самы даступны выхад з сітуацыі.

Мне здаецца, для многіх нашых людзей характэрна такая эмацыянальная няспеласць, якая праяўляецца высокім узроўнем суіцыдаў, высокім узроўнем алкагалізацыі, высокім працэнтам безадказных шлюбаў.

Акрамя таго, хутчэй за ўсё жанчына пакутавала на дэпрэсію. А для людзей у гэты час характэрна зніжэнне адчування цэласнасці жыцця. Не толькі свайго, але і іншых людзей. Для Іны дзіця было непасільнай нагрузкай. Маленькія дзеці плачуць, хварэюць. І калі жанчына не бачыць падтрымкі, дзіця можа стаць для яе крыніцай дадатковага стрэсу, які яна не ў сілах вытрымаць. Безумоўна, пасля таго, што яна здзейсніла, яна перажыла шок і, магчыма, ужо па-іншаму паглядзела на гэтую сітуацыю. Але было позна.

Марыя ЭЙСМАНТ.

ЗАКРЫТИЕ СИМФОНИЧЕСКОГО СЕЗОНА

ЧАЙКОВСКИЙ-ГАЛА



11 июня, 19.00

Белорусская государственная филармония.

Государственный академический симфонический оркестр
Дирижер – **Александр Анисимов**.
Солисты:
Марк Дробинский – виолончель (Франция),
Игорь Оловников – фортепиано,
Ирина Крикунова – сопрано (Россия),
Виктор Луцюк – тенор (Россия).

ПАРИ

Корниленко отказался от пол-ящика водки

Во время встречи с командой осенью прошлого года два фаната самарского клуба «Крылья Советов» сообщили нападающему, что поспорили на ящик водки: достигнет ли форвард сборной Беларуси отметки в пять забитых голов в турнире ФНЛ.

Сергей Корниленко поддержал спор и согласился разделить проигрыш в случае недостижения данного числа голов. Ставкой был ящик водки, сообщает by.tribuna.com.

Перед матчем 34-го тура против дзержинского «Химика», завершившегося победой «Крыльев» 3:0, на счету форварда сборной Беларуси было 4 гола в турнире. Выйдя в стартовом составе, нападающий забил 5-й и 6-й голы в ФНЛ, таким образом принеся победу не только своей команде, но и болельщику, верившему в голеадора.

На следующий день оба споривших фаната приехали на базу самарского клуба, чтобы поделиться выигрышем с нападающим. Сергей Корниленко от своей доли приза отказался, поблагодарив всех болельщиков за поддержку в этом сезоне.

Народная Воля http://www.nv-online.info 2 ЧЭРВЕНЯ 2015 г.

ЛИЧНАЯ ЖИЗНЬ



Юлия ВЫСОЦКАЯ:

«Не надо рассказывать, как тебе хорошо»

Каких-то полтора года назад казалось, что счастливее **Юлии Высоцкой** на белом свете никого нет. Она излучала счастье и не вполне отечественный позитив, вызывая уважение, легкую зависть *(«Сколько часов в ее сутках? Сколько заряда в ее аккумуляторе? Это вам не пятый айфон»*) и даже раздражение *(«Все куда-то бежит»)*. Женщины вокруг нее жаловались на погоду, власть, усталость, невкусные продукты, неверных мужчин и межбровные морщины. Она не жаловалась ни на что и никогда. Пробки не препятствовали ее телепортации из одной точки в другую, дождь не мешал вставать в шесть утра и пробегать положенную десятку, смелые законодательные инициативы не чинили помех ее растущему бизнесу, буррата в ее холодильнике всегда была от правильных коров. Морщины ее не брали – ну, или по крайней мере делали интереснее, значительнее, характернее. Даже любвеобильный мужчина (у режиссера Кончаловского до Юли было четыре официальные супруги и еще масса закадрового материала для книг) оказался совершенно приручен ею, простой девочкой из Минска. И неожиданно для самого себя переквалифицировался в эталонного семьянина.

Рефлексия, хандра, перепады настроения не значились в ДНК бренда «Юлия Высоцкая». Он весь – этот бренд – был выстроен на культе счастья. Передача, книги, журналы, кулинарные студии, именные продукты, гастрономическая школа на семейной вилле в Тоскане... Я провела несколько дней у Кончаловских на вилле близ Фояно-делла-Кьяна. Гостевой дом был отдан на растерзание десяти любознательным курсисткам из разных городов России. Апостол кулинарного кружка, Юля ни в коем случае не «исполняла». Она не была приглашенной звездой, отрабатывающей высокий гонорар, – просто весело жила с ними и ими. Учила готовить папарделле и тирамису. Травила байки, запас которых, учитывая немалое количество эфирных часов, давно должен был иссякнуть, но непостижимым образом пополнялся новыми. Возила знакомить с лучшими поварами – местными синьорами ризотто и спагетти. Вечерами, сидя у камина, вела задушевные беседы о главном в жизни женщины – и я не имею в виду температуру выпекания бисквита. У нее хотелось брать рецепт не бисквита, а счастья. *«Не выношу быть несчастной, не могу долго быть в плохом настроении, не люблю страдать. Меня даже в институте педагог упрекал: «Какая из тебя актриса, если ты страдать не любишь»*, – простодушно говорила Высоцкая в интервью.

